Да заканчэння пяцігоддзя плануецца пабудаваць больш як 1 млн жыллёвых «квадратаў» дзяржаўных здымных кватэр. Сёлета толькі ў Мінску пабудуюць 35 тысяч кв. м. арэнднага жылля. СТАР 2

Беларусь рыхтуецца прыняць яшчэ адзін буйны спартыўны форум. На мінулым тыдні быў падпісаны кантракт на правядзенне ў Мінску чэмпіянату Еўропы па боксе. СТАР 3

Уладзімір Крукоўскі — вядомы даследчык беларускай геральдыкі. Ён сабраў значную калекцыю шляхецкіх гербаў з выявамі і апісаннямі, а таксама з'яўляецца пачынальнікам беларускамоўнага плаката... СТАР 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

19 ЛЮТАГА 2013 г. АЎТОРАК № 32 (27397) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ІНВЕСТЫЦЫЙНЫ ІНСТРУМЕНТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЗНАЧЭННЯ

У Мінску прайшло першае пасяджэнне наглядальнага савета Банка развіцця пад старшынствам прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Мясніковіча. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага ўрада.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што на сённяшні дзень Банк развіцця прайшоў фазу арганізацыйнага станаўлення. У аснове работы банка дзве асноўныя мэты — садзейнічанне дынамічнаму развіццю эканомікі і фарміраванне канкурэнтнага банкаўскага асяроддзя ў Беларусі.

«Банк развіцця разглядаецца ўрадам як асноўны інструмент фінансавання інфраструктурных праектаў і праграм развіцця рэальнага сектара эканомікі. Праз праекты, што крэдытуюцца Банкам развіцця, плануецца таксама ствараць новыя высокапрадукцыйныя сектары народнай гаспадаркі краіны. Для гэтага ў банку сканцэнтраваны ўсе пытанні фінансавання дзяржаўных праграм, яму перададзены крэдыты, выдадзеныя дзяржаўнымі банкамі на іх рэалізацыю», — заявіў прэм'ер-міністр. Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў, што Банк развіцця павінен стаць магутным фільтрам, які назаўсёды выключыць меркаванне аб дзяржаўных рэсурсах як аб бязвыплатнай дапамозе.

Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што Банк развіцця — асноўная крэдытная арганізацыя, якая фінансуе інвестпраекты дзяржаўнага значэння. Дакладны, глыбокі аналіз крэдытнага партфеля на камерцыйную плацежаздольнасць павінен стаць асноўнай задачай структуры.

■ Расклад на заўтра

СПРАВАЗДАЧЫ, ДАВЕДКІ, ПЛАНЫ, ПРАТАКОЛЫ...

...гэта ўсё не пра работу канцылярыі, а пра нашы школы

Аб'ёмы дакументаабароту ў школе трэба тэрмінова змяншаць. З гэтым сёння ўжо ніхто не спрачаецца. Педагогі скардзяцца, што складанне шматлікіх планаў, напісанне справаздач, даведак, зрэзаў, правядзенне падлікаў аднімаюць у іх столькі часу і сіл, што гэта адбіваецца ўжо і на вучнях, ператвараецца ў пагрозу для псіхічнага здароўя. Таму настаўнікі настойліва просяць абараніць іх ад залішняй папяровай валакіты...

Узнімаў гэтую праблему ў сваім выступленні на рэспубліканскай нарадзе перад педагагічным актывам і Прэзідэнт нашай краіны:

— Трэба распрацаваць адзіны міжведамасны рэестр дакументаабароту і перавесці яго ў электронную форму. Адміністрацыйнае ўмяшанне іншых ведамстваў у дзейнасць адукацыйных устаноў павінна быць мінімальным. І я вас у чарговы раз усіх прашу: на месцах у школах, кіраўнікоў раённых аддзелаў адукацыі, інспектараў, дырэктараў, намеснікаў дырэктараў школ — не тэрарызуйце выкладчыкаў і настаўнікаў. І не прымушайце іх, крый вас Божа, пісаць планы, як камусьці хочацца.

Кіраванне з кантролем ці без?

Але, як кажуць, у настаўнікаў свая праўда, а ў кіруючых органаў — свая. Дарэчы, кіраўнікі ўстаноў адукацыі, у сваю чаргу, лічаць, што ў большай ступені папяровы ціск аказваецца не на педагогаў, а на адміністрацыю школы. Большасць справаздач — безумоўна, пры правільнай арганізацыі кіравання школай, можна зрабіць без прыцягнення настаўнікаў. «Але разгубленасць нярэдка выклікаюць ужо нават не колькасць і разнастайнасць справаздач і інфармацыйных даведак, а тэрміны іх выканання: часта іх трэба было здаць «яшчэ ўчора», прычым не проста адправіць па электроннай пошце, а прадубліраваць у папяровым варыянце за подпісам кіраўніка», — скардзяцца дырэктары школ. У многіх выпадках справаздачы рыхтуюцца ўвогуле на падставе вусных распараджэнняў работнікаў органаў кіравання адукацыяй ці пісьмовых указанняў зверху. Пры гэтым справаздачы носяць пераважна інфармацыйны характар і не могуць выкарыстоўвацца для аналізу якасці адукацыйнага працэсу. Хутчэй за ўсё, гэтая інфармацыя з'яўляецца схаванай формай пастаяннага кантролю кіруючых структур за работай устаноў адукацыі па розных кірунках дзейнасці...

Дырэктар ашмянскай сярэдняй школы №1 Міхаіл ГРУЖЭЎСКІ падрабязна прааналізаваў увесь дакументаабарот на прыкладзе сваёй школы:

— Рэальна за 2012 год уваходная інфармацыя па школе склала 1205 адзінак. З іх 527 адзінак — проста інфармацыя (пратаколы, пастановы, рашэнні, даведкі і іншае), 393 — палажэнні, загады, паведамленні і 285 — запыты аб падачы інфармацыі ад 10 службаў.

СТАР 2

СЛЁЗЫ РОСІЦЫ

ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка вёскі Ворзава Валянціна Баляславаўна МАРЦЫНКЕВІЧ *(на фотаздымку)* — адна з жывых сведак трагедыі, якая здарылася ў вёсцы Росіца колішняга Асвейскага, а цяпер Верхнядзвінскага раёна. Яна памятае, як у лютым 1943 года пачалася карная акцыя супраць мірнага насельніцтва, як жыхароў Росіцы і навакольных вёсак спачатку сагналі ў касцёл, а потым, падзяліўшы на групы, расстрэльвалі і палілі, вывозілі ў канцлагер. Валянціна, будучы малалетняй, была вывезена ў лагер Саласпілс. Прайшла праз неверагодныя пакуты і вярнулася дадому. Валянціна лічыць, што ёй дапамог ружанец, які падчас першай споведзі і прычасця ёй падарыў ксёндз Антоній ЛЯШЧЭВІЧ. Сам святар загінуў у полымі разам з вяскоўцамі.

Дагэтуль Валянціна Баляславаўна захоўвае намолены ружанец і лічыць яго сваім абярэгам. У гэтыя дні жанчына стала ўдзельніцай Дня памяці асвейскай трагедыі, які прайшоў у вёсцы Росіца. СТАР 3

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей ІЎЛЕЎ, намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:

«Беларусь не плануе вяртацца да пераводу стрэлак гадзіннікаў на сезонны: у нас захоўваецца прынятае ў 2011 годзе рашэнне аб адмене штогадовага пераводу гадзіннікавай стрэлкі ў апошнюю нядзелю сакавіка на адну гадзіну наперад і ў апошнюю нядзелю кастрычніка на адну гадзіну назад. Рашэнне аб адмене пераводу было прынята для таго, каб праводзіць падлік часу ўзгоднена з дзяржавамі — удзельніцамі Мытнага саюза. Такім чынам, мы захоўваем тое, што было, і ў нас узнікае натуральны пераход часу з суседняй расійскай вобласцю — адна гадзіна. У краінах Мытнага саюза час цяпер таксама не пераводзіцца».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.02.2013 г.

Долар ЗША	8590,00	▼
Еўра	11450,00	▼
Рас. руб.	285,00	▼
Укр. грыўня	1057,56	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 2°
Віцебск	– 2°
Гомель	– 3°
Гродна	– 1°
Магілёў	– 5°
Мінск	– 3°

■ Ведай нашых!

І ДАР'Я З ВІКТОРЫЯЙ!

Апошняя нядзеля прынесла пару спартыўных падзей, якія ўсцешылі нашых балельшчыкаў. Вікторыя Азаранка і Дар'я Домрачава ў чарговы раз дасягнулі важных перамог.

Фота БЕЛТА.

Айчынная тэніснай прыма Вікторыя Азаранка атрымала чарговую выніковую перамогу на прэстыжным турніры ў катарскай Досе, які сабраў на ўзбярэжжы Персідскага заліва найлепшыя сілы сучаснага жаночага тэніса. Праўда, галоўнае — гэта не проста перамога ў тэнісным першынстве, прыз, добры ганарар, галоўнае — вікторыя ў фінале менавіта над 31-гадовай амерыканкай Серэнай Уільямс — 7:6, 2:6, 6:3. Беларуска насамрэч літаральна зняла праклён, бо дагэтуль, уявіце, не магла перамагчы Серэну ў 11 паядынках!

— Я зрабіла ўсё лепш, чым у мінулых паядынках, — прызналася пераможца. — На любым турніры рада згуляць з Серэнай. Мы з ёй кожны раз прымушаем адна адну паказваць усё, на што здольныя, прыбаўляць, удасканальвацца. Гэта вялікая матывацыя — ведаць, што ёсць нехта, хто гатовы табе заўсёды кінуць выклік. Для мяне вялікі гонар знаходзіцца ў такой пазіцыі.

На шляху да перамогі Азаранка перасягнула такіх класных майстроў ракеткі, як полька Агнэшка Радванска і італьянка Сара Эрані. Аднак парадокс у тым, што Вікторыя не здолела захаваць першы радок Жаночай тэніснай асацыяцыі. Пасля двухгадовага перапынку Уільямс зноў у лідарах тэніснай гонкі і апярэдзвае Азаранку на 265 балаў.

Фота БЕЛТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка тэлеграмай і ў тэлефоннай размове павіншаваў Дар'ю Домрачаву з заваяваннем залатога медаля ў масстарце на чэмпіянаце свету па біятлоне і Вікторыю Азаранку з перамогай на турніры ў Досе, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

СТАР 3

ЗНОЎ СНЕГ І МАРАЗЫ

Сёння паўсюдна будзе ісці снег, месцамі слабая мяцеліца, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

На асобных участках дарог слізка. Тэмпература паветра — ад 0 да мінус 7 градусаў. У сераду і чацвер часам будзе ісці снег, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ад 2 да 9 марозу, а ўначы на сераду па ўсходзе і ўначы на чацвер на поўначы краіны маразы будуць дасягаць мінус 10—15 градусаў. Удзень — ад мінус 5 да плюс 1 градуса, толькі па Віцебскай вобласці — да мінус 8 градусаў. У пятніцу кароткачасовы снег чакаецца толькі на поўдні Беларусі. Уначы на пятніцу будзе ад мінус 3 да 10 марозу, а ўдзень — ад 0 да мінус 6 градусаў. На поўначы краіны будзе халадней. Там уначы прагназуецца мінус 11—15 градусаў, а ўдзень — 7—9 марозу. Паводле доўгатэрміновых прагнозаў сіноптыкаў, захаваецца марознае надвор'е і ў выхадныя. Месцамі будзе ісці кароткачасовы снег.

Сяргей КУРКАЧ.

ПА СПАЖЫВЕЦКІ КРЭДЫТ — З КАРТКАЙ

З 11 лютага 2013 года Беларусбанк аднавіў выдачу фізічным асобам крэдытаў на спажывецкія патрэбы з выкарыстаннем крэдытных картак.

«Пры гэтым, улічваючы кошт рэсурсаў, прыцягнутых ад фізічных асоб ва ўклады, банкам зменены памер працэнтнай стаўкі па крэдытных дагаворах, якія будуць заключацца нанава. Так, стаўкі па такіх крэдытах устаноўлены ў памеры 43% і 45% гадавых на тэрмін да 1 года і 5 гадоў адпаведна. Грамадзянам, якія пастаянна пражываюць і працуюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек, стаўкі традыцыйна ніжэй на 1 працэнтны пункт», — паведамілі ў прэс-службе банка.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЖУРНАЛІСТЫ ВВС БАСТУЮЦЬ СУПРАЦЬ ПРЫМУСОВАГА ЗВАЛЬНЕННЯ

Журналісты некалькіх падраздзяленняў найбуйнейшай брытанскай тэлерадыёвяшчальнай карпарацыі ВВС учора пачалі 24-гадзінны страйк пратэсту супраць прымусовага звальнення. Акцыя можа прывесці да перабояў тэле-і радыёвяшчання аднаго з вядучых СМІ свету, паведамляюць інфармагенцтвы. Супрацоўнікі пратэстуюць супраць намераў кіраўніцтва правесці скарачэнне ў BBC Scotland, Five Live, Asian Network, Big Screens, Newsbeat і Сусветнай службы. Акцыя праходзіць у Лондане, Бірмінгеме і некаторых іншых гарадах. Журналісты мяркуюць, што кіраўніцтва кампаніі дзеля зніжэння выдаткаў плануе ў бліжэйшыя месяцы скараціць каля дзвюх тысяч супрацоўнікаў і замест прафесіяналаў набраць менш кваліфікаваны персанал. Пры гэтым адзначаецца, што з 2004 года былі звольненыя ўжо сем тысяч работнікаў BBC. Па словах прадстаўнікоў саюза журналістаў, кіраўніцтва кампаніі траціць дзяржаўныя грошы на бескарысныя скарачэнні, пазбаўляючы вопытных і таленавітых журналістаў сродкаў да існавання.

ЧАВЕС ВЯРНУЎСЯ Ў ВЕНЕСУЭЛУ ПАСЛЯ АПЕРАЦЫІ

Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес у твітары абвясціў аб сваім вяртанні ў краіну пасля праходжання курсу лячэння ад раку на Кубе. Ён адзначыў, што працягне курс тэрапіі на радзіме. Чавес у асобным твіце падзякаваў цяперашняму кубінскаму лідару Раулю Кастра і былому кіраўніку краіны Фідэлю Кастра за падтрымку, а таксама прыгадаў урачоў і медсясцёр, якія клапаціліся аб ім падчас лячэння. Гэта першае з'яўленне Чавеса ў твітары з 1 лістапада.

На мінулым тыдні, 15 лютага, улады Венесуэлы апублікавалі першыя фотаздымкі прэзідэнта з тых часоў, як яму зрабілі чарговую аперацыю на Кубе. На здымках ён у бальнічнай палаце ў акружэнні сваіх дачок. У руках ён трымае нумар кубінскай газеты Granma за 14 лютага.

ТЭЛЕВІЗАР — ГАЛОЎНЫ ВОРАГ МУЖЧЫНСКАГА ЗДАРОЎЯ

Мужчыны, якія праводзяць перад тэлевізарам больш за 20 гадзін на тыдзень, не могуць пахваліцца высокай якасцю спермы. У іх насеннай вадкасці колькасць сперматазоідаў зніжана на 44%, піша The Independent. Медыкі падкрэсліваюць: сядзячы лад жыцця наносіць цяжкі ўдар мужчынскаму рэпрадуктыўнаму здароўю. Наадварот, рэгулярныя інтэнсіўныя трэніроўкі значна паляпшаюць яго (калі чалавек трэніруецца больш за 15 хвілін на тыдзень, колькасць сперматазоідаў будзе на 73% вышэй, чым у асоб, якія вядуць сядзячы лад жыцця). Гэтыя высновы навукоўцы зрабілі, даследаваўшы лад жыцця 189 здаровых мужчын 18-22 гадоў на працягу трох гадоў. Аказалася, акрамя сядзячага ладу жыцця, на стан спермы ўплывалі стрэс, харчаванне, курэнне. Больш за тое, высветлілася, што эфект рэгулярнай фізічнай актыўнасці ператвараўся ў нішто, калі мужчына шмат сядзеў перад тэлевізарам. А вось супрацоўнікі Універсітэта Шэфілда і Манчэстэра параўналі лад жыцця 939 мужчын з нізкай якасцю і 1310 мужчын з нармальнай якасцю спермы. У выніку высветлілася, што высокі індэкс масы цела, частае спажыванне алкаголю ці наркотыкаў не дужа і ўплывалі на якасць насеннай вадкасці. А вось больш свабодная бялізна, сапраўды, пазітыўна адбівалася на колькасці сперматазоідаў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У ЗША АЖЫЯТАЖНЫ ПОПЫТ НА ЗБРОЮ ПРЫВЁЎ ДА ЯЕ ДЭФІЦЫТУ

У ЗША рэкордны попыт на зброю прывёў да яе дэфіцыту ў крамах, піша USA Today. Амерыканцы, асцерагаючыся абмежаванняў на распаўсюджванне агнястрэльнай зброі, пачалі масава папаўняць яе запасы. У выніку стала складана дастаць такія самыя распаўсюджаныя тавары, як, напрыклад, патроны 22-га калібру. Акрамя таго, за апошні год цэны на зброю ў некаторых крамах выраслі больш чым у два разы. У шэрагу выпадкаў уладальнікі крам усталявалі абмежаванні на колькасць тавару, у разліку на аднаго пакупніка.

Нацыянальны фонд стралковага спорту тлумачыць павышаны попыт ростам папулярнасці стральбы як віду спорту, палявання, а таксама выкарыстання зброі для самаабароны. Між тым, у крамах сцвярджаюць, што рэкордны попыт забяспечваюць зусім не спартсмены, а ўладальнікі зброі, якія папаўняюць свае запасы, асцерагаючыся забарон або росту падаткаў.

Паводле інфармацыі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, безнаяўныя плацяжы складаюць 62,6% — па колькасці аперацый і 19% па іх суме

ЯК ВЫ РАЗЛІЧВАЕЦЕСЯ ЗА ПАКУПКІ — КАРТКАЙ АЛЬБО НАЯЎНЫМІ ГРАШЫМА?

Ала АСТРОЎСКАЯ, настаўніца нямецкай мовы гімназіі № 6 г. Мінска:

— Мне больш звыкла плаціць наяўнымі грашыма. У мяне ёсць такі прынцып: банкноты заўсёды павінны быць у кашальку. Для мяне так зручней распланаваць, якія сумы неабходна адкласці на пэўныя пакупкі. Ды і збоі ў сістэме аплаты карткай здараліся не ў самы зручны момант. Але, на мой погляд, пластык неабходны пры буйных плацяжах. Мяркую, што мала хто захоча насіць з сабой наяўнымі вялікія сумы грошай.

Настасся ДАКУЧАЕВА, студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ:

— Для мяне гэтае пытанне не прынцыповае. Ёсць у кашальку неабходная сума наяўнымі — аплачваю ўсё імі. Калі ж банкнотаў не хапае, на дапамогу прыходзіць картка. Даводзіцца часам чуць скаргі, што «завісае» тэрмінал аплаты, але я з такім сутыкалася рэдка. Куды часцей здараецца сітуацыя, калі ў касіра няма рэшты, і яна на ўсю краму крычыць напарніцы: «Размяняй грошы!» — і ідзе забраць патрэбную суму. Вось гэта мяне раздражняе, бо даводзіцца марнаваць час у чарзе.

Сцяпан МАЧАХІН, праваднік па суправаджэнні вагонаў у рамонт Мінскага вагоннага ўчастка Беларускай чыгункі:

— Я лічу, што картка мае перад наяўнымі грашыма шэраг значных пераваг. Яна займае ў кашальку вельмі мала месца, а рэшту з купюры, якая мае буйны намінал, у касе могуць выдаць цэлым стосам банкнотаў. Разбухлы ад дробных купюр партманет раздражняе. Таксама пры разліку карткай я атрымліваю рознага кшталту бонусы, у тым ліку і вяртанне на рахунак невялікага працэнта ад сумы пакупкі.

Падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ISSN 1990 - 763X

СПРАВАЗДАЧЫ, ДАВЕДКІ, ПЛАНЫ, ПРАТАКОЛЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Зыходная дакументацыя склала 899 адзінак (адпраўлена поштай 260, электроннай поштай — 639), з іх у раённы аддзел адукацыі — 373, а ўсе астатнія — у МНС, бальніцу, ідэалагічны аддзел райвыканкама і гэтак далей.

— Якасць усёй дакументацыі і аб'ектыўнасць прадастаўленай інфармацыі — персанальная зона адказнасці дырэктара, уключаючы вялікі дакументаабарот па фінансава-гаспадарчых пытаннях... Дырэктар павінен прагледзець усе пратаколы, справаздачы, адказы, праекты, загады, дэфектныя акты, каштарысы і г.д., унікнуць у сутнасць іх зместу, вывучыць уваходную дакументацыю, размеркаваць яе, забяспечыць кантроль за выкананнем і гэтак далей, — расказвае Міхаіл Гружэўскі. — Таму на працягу рабочага дня ў дырэктара і яго намеснікаў на работу з дакументамі затрачваецца шмат часу. Ці можа быць па-іншаму? Не ўпэўнены, таму што дырэктар, адміністрацыя — гэта кіраўнікі, а кіраванне без аналізу кантролю за дакументаабаротам не бывае. Пытанне ў іншым: як аптымізаваць гэты працэс, зменшыўшы выдаткі па часе і не дапусціць пераадрасацыі папяровай нагрузкі на настаўніка?

Кожнаму «кантралёру» — сваю даведку

Падзяліўся кіраўнік школы і сваім бачаннем прычын бюракратычнай папяровай валакіты. Па-першае, абсалютная колькасць інфармацыі змешчана ў статыстычных справаздачах на пачатак года, але ніхто са спецыялістаў сістэмы, як правіла, не паспявае (ці не жадае) іх «паднімаць» і з імі працаваць. Значна прасцей адправіць запыт ніжэй па «лесвіцы»... Па-другое, адна і тая ж інфармацыя часта патрабуецца адначасова розным службам, але ў рознай форме. І гэта не дазваляе мець стабільную і сістэмную інфармацыйную базу — яе ўвесь час даводзіцца адаптаваць пад новы запыт. Па-трэцяе, ва ўстанове адукацыі сфарміравана шмат розных саветаў, функцыі якіх пераклікаюцца: педагагічны савет, савет школы, папячыцельскі савет, метадычны савет, бацькоўскі камітэт, савет прафілактыкі і г.д. Усе яны вядуць пратаколы, прымаюць рашэнні, якія таксама даводзіцца кантраляваць адміністрацыі.

— Лічу, што школьны бацькоўскі камітэт можа інтэгравацца з папячыцельскім саветам. Не ўпэўнены і ў мэтазгоднасці дзейнасці савета школы. Грамадская кіраўніцкая актыўнасць вучняў у поўнай ступені можа рэалізоўвацца праз вучнёўскае самакіраванне, грамадскія арганізацыі, у тым ліку Моладзевую Палату пры раённым Савеце дэпутатаў. А бацькоўская — праз бацькоўскія камітэты, — падкрэсліў Міхаіл Гружэўскі.

Конкурсная актыўнасць — за межамі разумнага

Яшчэ адна крыніца залішняй паперавытворчасці — безадзнакавае навучанне ў пачатковай школе: настаўнікі пачатковых класаў моцна загружаны ўлікам і справаздачамі, якія вымагае безадзнакавае ацэньванне дзейнасці вучняў. Загадванне вучэбным кабінетам таксама прадугледжвае абавязковы стос дакументацыі і, самае галоўнае, назапашванне і развіццё вучэбна-метадычнай базы. Прычым гэтая нагрузка, што кладзецца на настаўніка, хоць і носіць неаплатны грамадскі характар, але вельмі сур'ёзна канкуруе. А колькасць конкурсаў, якія павінны праводзіцца школай, і ўвогуле выходзіць за рамкі разумнага! Сваю конкурсную актыўнасць рэалізуюць праз школу МНС, МУС, пошта, Чырвоны Крыж, Фонд Міру, ДТСААФ, установы культуры, грамадскія аб'яднанні і іншыя структуры.

— Шчыра кажучы, хацелася б увесь пералік конкурсаў ведаць на пачатак года, што дазволіла б нам спланаваць сваю работу. Да таго ж частку конкурсаў можна было б рэалізоўваць на базе ўстаноў дадатковай адукацыі і тым самым разгрузіць школу. А школе трэба пакінуць толькі конкурсы вучэбнай накіраванасці і конкурсы, звязаныя з бяспекай навучэнцаў. Таксама школа можа ўдзельнічаць у конкурсах па фальклорным, жывапісным, тэатральным і іншых кірунках, калі, вядома, гэтыя кірункі ў школе развіваюцца. А конкурсы па лініі пошты, Чырвонага Крыжа, ветэранскіх арганізацый, Фонду Міру, МУС і іншыя структуры няхай рэалізуюць праз свае грамадскія пярвічныя арганізацыі ў працоўных калектывах, — прапанаваў Міхаіл Гружэўскі.

Інфармацыйныя тэхналогіі — у дапамогу?

Дырэктар ашмянскай школы лічыць, што трэба выбудаваць сістэму абарачэння дакументаў, якія накіроўваюцца ў школу з Міністэрства адукацыі і іншых структур. Неабходна вызначыць канкрэтны пералік неабходнай рабочай дакументацыі, скіраванай на настаўніка, адміністрацыю, спецыяліста аддзела адукацыі — па такім жа прынцыпе, як гэта зрабіла галіновае міністэрства з пералікам дакументацыі для класнага кіраўніка. І ўжо на падставе зацверджанага пераліку школа, раённы аддзел ці ўпраўленне адукацыі маглі б сфарміраваць электронную базу звестак. Электронная база звестак павінна размяшчацца на сайце ў інтэрнэце і быць даступнай усім.

Па словах дырэктара школы, было б мэтазгодна вызначыць канкрэтную форму запаўнення кожнага дакумента на падставе адзіных патрабаванняў. А вось запыты ад іншых ведамстваў (Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, санстанцыі і г.д.) трэба ўпарадкаваць на ўзроўні міністэрстваў, абласных і раённых выканаўчых камітэтаў.

Дырэктары школ канстатуюць, што ім часта даводзіцца выслухоўваць ад настаўнікаў прэтэнзіі з-за выканання імі шэрагу функцый, якія непасрэдна не звязаны з адукацыйным працэсам, але вымагаюць афармлення шматлікіх папер. Размова ідзе пра арганізацыю харчавання школьнікаў, штодзённы ўлік пропускаў навучэнцаў, суправаджэнне дзяцей пры падвозе ў школу, ажыццяўленне прапускнога рэжыму ў фае школы і гэтак далей. Таму вялікую надзею кіраўнікі школ і педагогі ўскладаюць на ўкараненне сучасных інфармацыйных тэхналогій. Дарэчы, сёлета ў Мінскай вобласці да 1 верасня ў 36 школах з колькасцю навучэнцаў больш як 700 чалавек павінна з'явіцца электронная сістэма доступу, якая дазволіць вызваліць педагогаў ад арганізацыі прапускнога рэжыму і дапаможа весці аператыўны электронны ўлік прапушчаных заняткаў. Пры жаданні бацькі змогуць атрымаць SMS-паведамленні аб перамяшчэннях свайго дзіцяці — калі той прыйшоў у школу ці пайшоў дадому. А калі ўстанавіць падобныя электронныя ўстройствы ў бібліятэцы і школьнай сталовай, то пропуск можна было б выкарыстоўваць яшчэ і як чытацкі білет або электронны кашалёк. Адным словам, перспектывы адкрываюцца аптымістычныя і прывабныя...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Што трэба зрабіць для змяншэння «папяровага ціску» на школу:

— зменшыць колькасць уваходнай карэспандэнцыі;

— граматна выкарыстоўваць на ўсіх узроўнях сістэмы адукацыі зацверджаную дзяржаўную і ведамасную статыстычную справаздачнасць;

— зацвердзіць пералік абавязковай дакументацыі для настаўніка і намесніка дырэктара;

— стварыць адзіны каляндар выхаваўчых мерапрыемстваў па лініі ўсіх міжведамасных структур, зацверджаны Міністэрствам адукацыі;

— спрасціць дакументацыю па такіх кірунках, як папярэджванне і ліквідацыя надзвычайных сітуацый і грамадзянская абарона;

— выкарыстоўваць інфармацыйна-камунікатыўныя тэхналогіі ў адукацыйна-выхаваўчым працэсе.

ДВА ГАДЫ КАЛОНІІ

Гродзенскі міжгарнізонны ваенны суд прыгаварыў пагранічніка, які не паведаміў аб шведскім самалёце-парушальніку (а значыць, парушыў службовыя абавязкі), да двух гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму.

У Вярхоўным Судзе Беларусі паведамляюць, што ваеннаслужачага прызналі вінаватым у парушэнні правілаў нясення пагранічнай службы. Як вядома, 4 ліпеня мінулага года каля 5.57 падданыя Каралеўства Швецыі на лёгкаматорным самалёце на гранічна малой вышыні з боку Літвы паблізу населенага пункта Баранавічы Іўеўскага раёна незаконна перасяклі дзяржаўную мяжу Беларусі. Падчас палёту экіпаж выкінуў плюшавых медзведзянят. Падчас перасячэння дзяржаўнай мяжы самалёт быў своечасова выяўлены пагранічным нарадам. Аб здарэнні нарад далажыў дзяжурнаму пагранічнаму пасту «Суботнікі», які ўваходзіў у склад нарада па ахове дзяржаўнай мяжы. Дзяжурны пагранпаста па ўласнай нядбайнасці не перадаў прынятае данясенне аб назіранні лятальнага апарата над мяжой у падраздзяленне ВПС і СПА Узброеных Сіл Беларусі, вышэйстаячаму дзяжурнаму пагранічнага атрада. Паколькі апавяшчэння не было, падраздзяленні супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі не былі переведзены ў рэжым павышэння ступені баявой гатоўнасці, не выявілі і не прадухілілі парушэнне замежным паветраным суднам дзяржаўнай мяжы Беларусі.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Прамая лінія

Арэнднага жылля будзе будавацца больш

Канцэпцыя дзяржаўнай жыллёвай палітыкі Рэспублікі Беларусь да 2015 года і іншыя «кватэрныя» пытанні нашых чытачоў у адказах начальніка ўпраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандра ГОРВАЛЯ.

— Мой сын стаіць у чарзе маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў з 2009 года. У 2011 годзе ён разам з жонкай падаваў заяву ў банк на атрыманне льготнага крэдыту па старым заканадаўстве. Аднак дакументы ў банку тады не прынялі, бо льготнае крэдытаванне было прыпынена. Сёлета яны зноў спрабавалі атрымаць крэдыт, але і цяпер яго не даюць. Адмову тлумачаць тым, што ў банка ёсць ліміты грашовых сродкаў, якія накіроўваюцца на льготнае крэдытаванне. Ці правільна ім адмовілі?

Ядзвіга СЦЯПАНАЎНА, *г. Драгічын.*

— А ці маюць яны зараз права на атрыманне льготнага крэдыту па новым указе?

— Так, маюць. Летась мой сын самастойна пачаў будаваць індывідуальны жылы дом. Зрабіў нулявы цыкл. Сёлета плануе зрабіць каробку. Вось мы і разлічваем атрымаць льготны крэдыт.

— Гэтае пытанне вам трэба вырашаць у раёне ці ў вобласці. Фінансавыя сродкі мы цэнтралізавана размяркоўваем па абласцях. А далей вобласць ужо дзеліць іх па рэгіёнах. Пэўны аб'ём накіроўваецца на будаўніцтва шматкватэрных дамоў, частка сродкаў ідзе на індывідуальнае будаўніцтва.

— Гэта зразумела. Але нам паведамілі, што ў першым паўгоддзі сёлета будуць крэдытавацца тыя людзі, якія ўжо больш за два гады будуюць індывідуальнае жыллё. Зараз у нас нават не бяруць дакументы. Што рабіць?

— Вам трэба напісаць адпаведную заяву на імя старшыні гарвыканкама. Тады мясцовыя службы будуць дакладна ведаць пра вашу праблему.

— З'яўляюся ўдзельнікам долевага будаўніцтва ў сталіцы. Дом будуецца ўжо каля 2 гадоў. Зараз забудоўшчыкі нам выстаўляюць новыя «плацёжкі», дзе прапануюць праіндэксаваць нават тыя работы, што былі ўжо раней зроблены і намі цалкам аплачаны. Ці справядліва гэта?

Дзмітрый ЗАРЭМБА, *г. Мінск.*

— Не. Так нельга. Новыя індэксы распаўсюджваюцца толькі на нявыкананыя работы. Вам трэба звяртацца ў мясцовы выканкам.

Пачалася распрацоўка нарматыўнай базы Нацыянальнага агенцтва па іпатэчным крэдытаванні жыллёвага будаўніцтва.

— Аднак там нашы заявы накіроўваюць зноў ва УКБ раёна. Нічога не мяняецца.

— Тады вам трэба абараняць свае правы ў судзе.

— Мне днямі далі на подпіс дадатковае пагадненне, дзе гаворыцца пра новыя індэксы. Калі я яго за тыдзень не падпішу, то са мной скасуюць дагавор. А ў суд мне калі прэтэнзіі накіроўваць — зараз ці пасля таго, як падпішу гэтае пагадненне?

— У суд звяртацца лепш зараз. Пасля таго, як вы праінфармуеце забудоўшчыка аб тым, што падалі на яго ў суд, то ён ужо ўвогуле не будзе мець права скасаваць з вамі дагавор.

— Прывітанне, Аляксандр Віталевіч апошнім часам па тэлебачанні і ў друку ўздымаецца тэма арэнднага жылля. Яно ўжо будуецца ў нашай краіне? Ці гэта толькі планы?

Вераніка МІРОНЧЫК, *г. Мінск.*

— Такое арэнднае жыллё ўжо будуецца ў Беларусі. Першыя два дамы ўжо здалі ў эксплуатацыю ў снежні 2012 года.

— Гэтыя дамы былі пабудаваны ў Мінску?

— Не, не ў Мінску, а ў абласцях. Сталіца заданне мінулага года па такім жыллі не выканала. Арэндныя дамы ў Мінску сёння дабудоўваюцца.

— А сёлета ў галоўным мегаполісе краіны такое жыллё ўжо будзе?

— Так. Згодна з заданнем на 2013 год, для Мінска прадугледжана мінімальная планка такога жылля ў памеры 35 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы. Магчыма, што будзе пабудавана нават больш. Зараз прапрацоўваецца пытанне аб істотным дадатковым фінансаванні на арэнднае жыллё. Увогуле па краіне плануецца пабудаваць сёлета не менш як 200 тысяч квадратных метраў жылля, якое будзе выкарыстоўвацца для доўгатэрміновай арэнды.

Сёлета ў Мінску будзе пабудавана 35 тысяч кв. м. арэнднага жылля. Да заканчэння пяцігоддзя плануецца пабудаваць у Беларусі больш як 1 млн жыллёвых «квадратаў» дзяржаўных здымных кватэр.

— А якія планы тут на наступныя гады?

— Гэты кірунак будзе развівацца і надалей. Да заканчэння пяцігоддзя плануецца пабудаваць не менш як 1 млн квадратных метраў агульнай плошчы арэнднага жылля па ўсёй краіне. Заўважу, што сістэма арэнднага жылля будзе развівацца з паскоранай дынамікай.

— А для каго будуецца гэта жыллё?

— У адпаведнасці з Указам № 512 кіраўніка дзяржавы, такое жыллё выдзяляецца грамадзянам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У першую чаргу менавіта для такіх грамадзян. Мясцовымі выканкамамі вызначаецца кошт на такую арэнду. Калі параўноўваць з цэнамі, напрыклад, у сталіцы нашай краіны, то атрымліваецца, што кошт арэнднага жылля дзяржаўнага жыллёвага фонду прыкладна ў 2—2,5 раза меншы, чым здымнага прыватнага жылля.

— Калі я вас правільна зразумела, то пры атрыманні арэнднага жылля мяне з гэтай жыллёвай чаргі выкрасляць?

— Не. Пакуль дзейнае заканадаўства не прадугледжвае зняцце з уліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў тых грамадзян, якія атрымалі арэнднае жыллё. Разам з тым, сёння гэтае пытанне прапрацоўваецца больш дэталёва. Магчыма, што будуць і выкрэсліваць з чаргі.

— Будзе так, што я жыллё ўжо і атрымала?

— Так. Арэнднае жыллё прапануецца чаргавіку на бестэрміновы час. Які сэнс даваць чалавеку арэндную кватэру, пакідаць яго потым у жыллёвай чарзе, а праз нейкі час выдзяляць яшчэ і льготны крэдыт пад будаўніцтва жылля?

— Удакладніце мне наступнае. Пасля атрымання арэнднага жылля з дзяржаўнага жыллёвага фонду я ўжо льготны крэдыт не атрымаю?

— Цяпер такіх кватарантаў з жыллёвай чаргі яшчэ не выкрэсліваюць. Пакуль так.

— Зразумела. Дзякуй вам за тлумачэнні.

— Днямі чуў пра праекты ўзвядзення шматкватэрных дамоў, дзе прадугледжаны так званыя кватэры-студыі. Такія маленькія кватэры ўжо існуюць?

Уладзіслаў БАЛІБОК, *Мінскі раён.*

— Такое жыллё пакуль праектуюць у долевым будаўніцтве толькі камерцыйныя забудоўшчыкі. Менавіта яны будуюць па індывідуальных праектах. Зараз праектныя інстытуты працуюць над тым, каб і ў тыпавым жыллі была магчымасць стварэння такіх маламетражных кватэр, кватэр-студый, якія будуць для спажыўцоў каштаваць менш.

— А што там прынцыпова меншых памераў? У такіх кватэрах зусім маленькая кухня?

— Кватэры-студыі ўяўляюць сабой увогуле адно вялікае памяшканне, адзін пакой. Кухонны блок там прысутнічае ў выглядзе нейкай своеасаблівай нішы, такога невялікага кутка мінімальных памераў. Агульная плошча такіх памяшканняў вагаецца ад 18 да 26 квадратных метраў. Асобна там прысутнічае санітарны блок. Такое жыллё будзе каштаваць значна танней, чым стандартная кватэра. А ў адзінокіх людзей ці бяздзетнай сям'і падобнае жыллё будзе карыстацца ўстойлівым попытам.

— Вашым ведамствам распрацоўвалася нейкая новая праграма па жыллёвай палітыцы на бліжэйшыя гады. Што новага там прадугледжана?

— Маецца на ўвазе канцэпцыя дзяржаўнай жыллёвай палітыкі Рэспублікі Беларусь да 2015 года? Так. Там прадугледжаны змяненні ў парадку пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

— Канцэпцыя прадугледжвае больш жорсткія ўмовы для людзей пры будаўніцтве жылля?

— Прыкладна так. Сама жыллёвая палітыка прадугледжвае большую адказнасць людзей за паляпшэнне сваіх жыллёвых умоў. Прапануецца больш скрупулёзна выбіраць тых, каго дзяржава будзе ставіць на жыллёвы ўлік, а потым выкарыстоўваць механізмы падтрымкі пры будаўніцтве жылля. Вызначаецца неабходнасць павелічэння аб'ёмаў індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва і выдзяленне на гэта больш зямельных участкаў. Прадугледжваецца стварэнне адпаведнай інфраструктуры ў зямельных масівах, каб людзі мелі неабходныя ўмовы для ажыццяўлення індывідуальнага будаўніцтва. Будуць новыя праекты жылых дамоў з энергаэфектыўнымі ўстаноўкамі, якія дазволяць істотна скараціць спажыванне цеплавой энергіі.

— А крэдыты пад жыллё стануць больш даступнымі?

— Па льготных крэдытах у перыяд да 2015 года застануцца тыя ўмовы, якія існуюць сёння. Дзеля таго, каб у людзей былі дадатковыя магчымасці па фінансаванні будаўніцтва жылля, то тут асноўны ўпор прадугледжваецца па сістэме іпатэкі.

Напрыканцы мінулага года мы пачалі распрацоўваць нарматыўную базу і фарміруем арганізацыйна Нацыянальнае агенцтва па іпатэчным крэдытаванні жыллёвага будаўніцтва. Гэта будзе фінансавы механізм, які дазволіць людзям атрымліваць крэдыты па больш прымальных працэнтах, чым зараз прапануюцца пры камерцыйным крэдытаванні.

— Ці вывучаюць нашы спецыялісты вопыт Расіі па гэтых кірунках?

— Мы з імі паспяхова супрацоўнічаем.

— У мяне ёсць жонка і сын. Мы жывём у двухпакаёвай кватэры разам з бацькамі жонкі. Наша сям'я стаіць у чарзе маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў толькі 7 гадоў. Ці магу я будаваць для нас асобную кватэру ў горадзе-спадарожніку? У якім горадзе гэта будзе?

Антон РАДЗЮКЕВІЧ, *г. Мінск.*

— У Смалявічах зараз будуецца жыллё для чаргавікоў Мінска.

— А на якіх умовах?

— Вам трэба звярнуцца ў адміністрацыю раёна па месцы пастаноўкі на жыллёвы ўлік. Там спецыялісты прымаюць заявы ад тых, хто жадае будавацца ў гарадах-спадарожніках.

— А ці прадугледжвае такое будаўніцтва выкарыстанне льготных крэдытаў?

— У такіх гарадах умовы выдзялення льготных крэдытаў больш прывабныя — такія, як у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек.

— А сацыяльная інфраструктура ў гэтых жыллёвых комплексах ужо ёсць? Праблем не будзе з дзіцячымі садкамі, школамі, банкамі і г.д.?

— Праектныя рашэнні ўжо ёсць. Прадугледжваецца будаўніцтва цэльнага самадастатковага жылога мікрараёна, дзе ўсе пытанні інфраструктуры вырашаюцца на адпаведным узроўні.

Кватэры-студыі будуць мець агульную плошчу ад 18 да 26 квадратных метраў.

— А кошт будаўніцтва квадратнага метра жылля ў гэтых дамах будзе ніжэйшы, чым у Мінску?

— Не. Кошт будаўніцтва панэльнага дома будзе аднолькавым. Можа, будзе нават крыху даражэй, бо трэба ўлічваць яшчэ і транспартныя выдаткі на перавозку будаўнічых блокаў з Мінска ў горад-спадарожнік. Плюсам тут з'яўляецца выкарыстанне больш прывабных крэдытаў і не такая вялікая чарга, як у сталіцы.

— Мы жывём у 4-кватэрным двухпавярховым жылым доме. Там — два ўваходы. Кватэра ў нас маленькая. Ці магчыма нам зрабіць дабудову, каб павялічыць плошчу жылля?

Аліна ШУЦЬКО,

Стаўбцоўскі раён, вёска Ніўная.

— Дакладна адразу адказаць цяжка. Тут трэба разгледзець праект вашага дома. Неабходна высветліць, ці магчыма там узвесці нейкую дабудову, яна не замінала жылым памяшканням іншых жыхароў дома, каб не было праблем з камунікацыямі. Тэарэтычна зрабіць дабудову магчыма, але... Вам спачатку трэба звярнуцца да раённага архітэктара, які ўжо на месцы будзе прымаць канчатковае рашэнне.

Сяргей КУРКАЧ

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ПРАВЯДЗЕННІ КОНКУРСУ

Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт паведамляе аб правядзенні конкурсу па выбары інвестара для заключэння інвестыцыйнага дагавора па рэалізацыі праекта «Праектаванне і будаўніцтва шматфункцыянальнага комплексу на скрыжаванні пр. Незалежнасці — вул. Макаёнка ў г. Мінску» (далей — конкурс) 22 сакавіка 2013 г. у 11.00 па адрасе: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 8, каб. 320.

Арганізатар конкурсу: Мінскі гарадскі выканаўчы камітэт, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 8.

У конкурсе могуць прыняць удзел юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі Рэспублікі Беларусь, замежныя юрыдычныя асобы і замежныя арганізацыі, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, створаныя ў адпаведнасці з заканадаўствам замежных дзяржаў.

Асобай, якая жадае стаць прэтэндэнтам на ўдзел у конкурсе, арганізатару конкурсу падаюцца наступныя дакументы:

1) заяўка на ўдзел у конкурсе па вызначанай форме;

2) юрыдычнай асобай Рэспублікі Беларусь:

— копія статута (устаноўчага дагавора — для камерцыйнай арганізацыі, якая дзейнічае толькі на падставе ўстаноўчага дагавора), які мае штамп, што сведчыць аб правядзенні дзяржаўнай рэгістрацыі, пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі і іх арыгіналы для зверкі;

— даверанасць (іншая грамадзянска-прававая здзелка) прадстаўніку юрыдычнай асобы (калі юрыдычную асобу прадстаўляе не кіраўнік) або дакумент, які пацвярджае паўнамоцтвы кіраўніка юрыдычнай асобы (загад аб прызначэнні на пасаду кіраўніка або завераная выпіска з рашэння агульнага сходу ўдзельнікаў, рады дырэктараў (назіральнай рады) альбо іншага органа кіравання юрыдычнай асобы ў адпаведнасці з яе ўстаноўчымі дакументамі, або працоўны дагавор (кантракт), або іншы аналагічны дакумент);

індывідуальным прадпрымальнікам Рэспублікі Беларусь:

— копія пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка і яго арыгінал для зверкі;

— натарыяльна заверэная даверанасць (для прадстаўніка індывідуальнага прадпрымальніка);

замежнай юрыдычнай асобай або іншай замежнай арганізацыяй, якая не з'яўляецца юрыдычнай асобай, створанай у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы:

— легалізаваныя (апастыляваныя) у вызначаным парадку копіі ўстаноўчых дакументаў і выпіска з гандлёвага рэестра (рэгістра) краіны паходжання (выпіска павінна быць зроблена не пазней як за 2 месяцы да даты падачы заявы на ўдзел у конкурсе) або іншы раўназначны доказ юрыдычнага статусу ў адпаведнасці з заканадаўствам краіны паходжання з натарыяльна засведчаным перакладам на беларускую або рускую мову;

— легалізаваная (апастыляваная) у вызначаным парадку даверанасць (іншая грамадзянска-прававая здзелка) прадстаўніку юрыдычнай асобы, замежнай арганізацыі, якая не з'яўляецца юрыдычнай асобай, створанай у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы, і/або іншыя легалізаваныя (апастыляваныя) у вызначаным парадку дакументы з натарыяльна засведчаным перакладам на беларускую або рускую мову;

3) дакумент, які пацвярджае ўнясенне задатку;

4) аўдыторскія заключэнні аб фінансавым стане асобы, якая жадае стаць прэтэндэнтам на ўдзел у конкурсе, за 2011 г. і 9 месяцаў 2012 г., якія пацвярджаюць наяўнасць чыстых актываў (уласнага капіталу) на суму не менш як 10 млн долараў ЗША (эквіваленту 10 млн долараў ЗША) на дату складання справаздачнасці. Для замежных юрыдычных асоб і замежных арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, дадзенае заключэнне павінна быць легалізавана (апастылявана) у вызначаным парадку з натарыяльна засведчаным перакладам на рускую (беларускую) мову, калі яно складзена не на рускай (беларускай) мове.

5) дакумент, які пацвярджае размяшчэнне асобай, якая жадае стаць прэтэндэнтам на ўдзел у конкурсе, у адным з банкаў Рэспублікі Беларусь грашовых сродкаў у памеры 1 млн долараў ЗША (эквівалент 1 млн долараў ЗША). Прэтэндэнт, які не стаў удзельнікам конкурсу, і ўдзельнік конкурсу, які не выйграў конкурс, мае права свабодна распараджацца паказанымі грашовымі сродкамі праз 5 працоўных дзён з моманту падвядзення вынікаў конкурсу (падпісання пратакола № 2 пасяджэння конкурснай камісіі) адпаведна. Пераможца конкурсу абавязаны выкарыстаць грашовыя сродкі, прадугледжаныя ў гэтым падпункце, выключна на мэты рэалізацыі праекта.

Заяўка і іншыя дакументы на ўдзел у конкурсе перадаюцца арганізатару конкурсу фізічнай асобай, прадстаўніком юрыдычнай асобы, арганізацыі, якая не з'яўляецца юрыдычнай асобай, індывідуальным прадпрымальнікам (яго прадстаўніком) асабіста.

Пры падачы заяўкі на ўдзел у конкурсе і іншых дакументаў прадстаўнік юрыдычнай асобы, арганізацыі, якая не з'яўляецца юрыдычнай асобай, індывідуальны прадпрымальнік (яго прадстаўнік) прад'яўляе арыгінал дакумента, што сведчыць асобу, і прадастаўляе яго копію для зверкі.

У выпадку неадпаведнасці прад'яўленых дакументаў названым патрабаванням арганізатар конкурсу вяртае гэтыя дакументы асобе, якая падала іх.

У выпадку адпаведнасці пададзеных дакументаў названым патрабаванням асоба, якая іх падала, становіцца прэтэндэнтам, і ёй у дзень падачы заяўкі і іншых дакументаў на ўдзел у конкурсе перадаецца конкурсная дакументацыя на ўдзел у конкурсе, у адпаведнасці з якой яна прадстаўляе конкурсную прапанову ў дзень правядзення конкурсу.

Пералік дакументаў, якія ўваходзяць у склад конкурснай прапановы:

1) табліца паказчыкаў конкурснай прапановы прэтэндэнта па форме, вызначанай арганізатарам;

звесткі пра крыніцы сродкаў на рэалізацыю інвестыцыйнага праекта па форме, вызначанай арганізатарам. Пры гэтым звесткі аб наяўнасці ўласных сродкаў пацвярджаюцца звесткамі аўдыторскага заключэння аб фінансавым стане прэтэндэнта за 2011 г. і 9 месяцаў 2012 г.; аб пазыковых сродках — банкаўскімі пісьмамі або іншымі дакументамі, якія пацвярджаюць намеры крэдытараў (камерцыйных банкаў), іншых інвестараў прадаставіць свае сродкі ў форме крэдытаў, пазык, прамых інвестыцый для рэалізацыі інвестыцыйнага праекта з указаннем сум пазыковых сродкаў і ўмоў іх прадастаўлення;

2) бізнэс-план або тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне мэтазгоднасці рэалізацыі праекта, зацверджаныя прэтэндэнтам;

3) пералік інвестыцыйных праектаў, якія рэалізаваны або рэалізуюцца ўдзельнікам конкурсу па форме, вызначанай арганізатарам;

4) горадабудаўнічая канцэпцыя забудовы квартала ў складзе:

— агульная тлумачальная запіска канцэпцыі праекта з асноўнымі тэхніка-эканамічнымі паказчыкамі праекта;

— схема генеральнага плана;

— аб'ёмна-планіровачнае рашэнне праекта;

— схемы планаў, фасадаў, разрэзаў у М 1:200, 1:500;

— фотафіксацыя (не менш як 3 пункты, у т.л. панарамная фатаграфія);

— візуалізацыя горадабудаўнічай канцэпцыі праекта (з пунктаў фотафіксацыі);

— разгортка праекта з боку пр. Незалежнасці і вул. Макаёнка ў М 1:1000.

Выходныя звесткі праекта прыведзены ў горадабудаўнічым пашпарце (падаецца прэтэндэнту ў электронным выглядзе) з кароткай характарыстыкай аб'екта і патрабаваннямі да выкарыстання і забудовы ўчастка і ў тапаграфічным плане зямельнага ўчастка (падаецца прэтэндэнту ў папяровым выглядзе), і ўручаюцца прэтэндэнту (яго ўпаўнаважанаму прадстаўніку) пры рэгістрацыі заяўкі на ўдзел у конкурсе.

5) абавязацельства аб фінансаванні праектавання і будаўніцтва аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры па форме, вызначанай арганізатарам;

6) вопіс дакументаў, што падаюцца ў закрытым пакеце конкурснай прапановы (на асобным лісце).

Асоба, якая жадае стаць прэтэндэнтам на ўдзел у конкурсе, уносіць задатак у суме 10 тыс. долараў ЗША альбо эквівалентную суму ў еўра (для замежных юрыдычных асоб і замежных арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі, створаных у адпаведнасці з заканадаўствам замежнай дзяржавы) з пералікам па курсе каціровак гэтых валют, вызначаным Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату плацяжа, альбо эквівалентную суму ў беларускіх рублях па афіцыйным курсе беларускага рубля, вызначаным Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь на дату аплаты (для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў Рэспублікі Беларусь) у ААТ «ААБ Беларусбанк», код 795, код плацяжу 05520, УНП 101530339, атрымальнік плацяжу — ГУ МФ РБ па г. Мінску, прызначэнне плацяжу — задатак для ўдзелу ў конкурсе па выбары інвестара, на наступныя рахункі:

у доларах ЗША — 3600101000086;

у еўра — 3600101000099;

у беларускіх рублях — 3602101000026.

Задатак асобам, якія не сталі прэтэндэнтамі, прэтэндэнтам, якія не сталі ўдзельнікамі конкурсу, і ўдзельнікам конкурсу, якія не выйгралі конкурс, вяртаецца на працягу 5 працоўных дзён з моманту адмовы ў допуску да ўдзелу ў конкурсе альбо з моманту падвядзення вынікаў конкурсу (падпісання пратакола № 2 пасяджэння конкурснай камісіі) адпаведна.

Пераможца конкурсу павінен пакрыць выдаткі на арганізацыю і правядзенне конкурсу на працягу 3 працоўных дзён з моманту падвядзення вынікаў конкурсу (падпісання пратакола № 2) і да падпісання інвестыцыйнага дагавора падаць арганізатару конкурсу завераныя належным чынам копіі плацежных дакументаў, якія пацвярджаюць пакрыццё выдаткаў на арганізацыю і правядзенне конкурсу.

Задатак, пералічаны пераможцам конкурсу, залічваецца ў лік пакрыцця выдаткаў. Астатняя частка задатку пералічваецца арганізатарам конкурсу пераможцу конкурсу на працягу 5 працоўных дзён з моманту рэгістрацыі інвестыцыйнага дагавора ў Дзяржаўным рэестры інвестыцыйных дагавораў з Рэспублікай Беларусь.

Працэнты на суму задатку не налічваюцца і не выплачваюцца.

У выпадку адмовы пераможцы конкурсу ад падпісання абавязацельства аб фінансаванні праектавання і будаўніцтва аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры і (або) інвестыцыйнага дагавора (незаключэнне інвестыцыйнага дагавора) у вызначаныя тэрміны задатак пераможцу конкурсу не вяртаецца.

Умовай конкурсу з'яўляецца прынятае прэтэндэнтам (удзельнікам конкурсу) абавязацельстваў па рэалізацыі праекта «Праектаванне і будаўніцтва шматфункцыянальнага комплексу на скрыжаванні пр. Незалежнасці — вул. Макаёнка ў г. Мінску», у т.л.:

прадастаўленне распрацаванай горадабудаўнічай канцэпцыі забудовы ўчастка ў межах пр. Незалежнасці — вул. Макаёнка;

прыцягненне да рэалізацыі праекта генеральнай падраднай арганізацыі — рэзідэнта Рэспублікі Беларусь;

распрацоўка праектнай дакументацыі за кошт уласных сродкаў без прыцягнення грашовых сродкаў фізічных асоб;

кампенсацыя страт землекарыстальнікам, звязаных з адабраннем і зносам аб'ектаў нерухомасці на зямельным участку, які выдзяляецца, за кошт уласных (пазыковых, прыцягнутых) сродкаў без прыцягнення грашовых сродкаў фізічных асоб;

выкананне патрабаванняў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай, будаўнічай, прыродаахоўнай дзейнасці, аховы гісторыка-культурнай спадчыны і інш.;

увод у эксплуатацыю шматузроўневых гараж-стаянак адначасова з аб'ектамі жыллёвага будаўніцтва;

выкананне вызначаных патрабаванняў па праектаванні і будаўніцтве шматфункцыянальнага комплексу, прадугледжаных заканадаўствам, тэхнічнымі нарматыўна-прававымі актамі і горадабудаўнічымі дакументамі;

заключэнне з Мінскім гарвыканкамам дагавора

■ Як жывяце, землякі?

Брэстчына

НАГАДАЛА ПРА СЯБЕ ПАВОДКА

Набліжэнне вясновай паводкі адчулі на Століншчыне.

На мінулым тыдні ў рабочым пасёлку Рэчыца ўтварылася рэальная пагроза падтаплення 300 падворкаў. Снег інтэнсіўна раставаў, а станцыя мясцовай ЖКГ не справілася з адпампоўваннем вады з вадаёма ліўневай каналізацыі. У выніку ўзнікла пагроза затаплення падворкаў па вуліцы Кутузава.

На дапамогу прыйшлі супрацоўнікі МНС. Аўтацыстэрна Столінскага райаддзела МНС перамясціла ваду з вадаёма ліўнёўкі ў закрытую ліўневую сістэму на адлегласці 120 метраў. За дзень лішкі вады прыбралі. З астатнім спраўляецца помпавая станцыя жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

З БРЭСТА — У БУРГАС І КАЛІНІНГРАД САМАЛЁТАМ

Сёлета пачне курсіраваць самалёт «Брэст — Калінінград»

У савецкія часы Брэсцкі аэрапорт працаваў у даволі напружаным рэжыме. Брастаўчане лёталі па справах, на адпачынак у розныя гарады Савецкага Саюза. Потым пералёт стаў параўнальна дарагім, і паступова зніклі ўсе рэгулярныя авіярэйсы. Летась не было ніводнага пастаяннага рэйса, прызямляліся толькі грузавыя самалёты і пасажырскія чартары.

Начальнік брэсцкага філіяла прадпрыемства «Белаэранавігацыя» Міхаіл Скрабко паведаміў, што сёлета пачне курсіраваць 50-месны самалёт «Брэст — Калінінград». Усяго за гадзіну можна патрапіць з самага заходняга горада Беларусі ў сталіцу расійскай Прыбалтыкі. Палёты запланаваны з 3 чэрвеня да верасня. Яшчэ адна лінія, пачынаючы з 5 чэрвеня, звяжа Брэст з Бургасам, горадам на чарнаморскім узбярэжжы Балгарыі. Рэйсы будуць ажыццяўляцца праз кожныя 10 дзён. Кошт білета на балгарскі курорт пачынаецца ад 300 еўра. Прадоўжацца і чартарныя перавозкі.

Так, напрыклад, нядаўна невялікі рэактыўны лайнер даставіў у Брэст трох паляўнічых з Санкт-Пецярбурга. Пакуль экіпаж адпачываў у гасцініцы, госці здабылі трафеі ў Белавежскай пушчы, а потым хутка вярнуліся дадому. Летась такім чынам на Брэстчыну прыбылі 33 паляўнічыя.

Яна СВЕТАВА.

Гомельшчына

ПЦІЧ ВЫХОДЗІЦЬ НА ДАРОГУ

Участак аўтамабільнай дарогі «Лучыцы — Хвойня» ў Петрыкаўскім раёне падтоплены талымі і паводкавымі водамі

Як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, падчас абследавання дарогі выяўлена, што на адлегласці каля 100 м узровень вады на дарозе складае 15-35 см. Праезд па ёй магчымы толькі грузавым транспартам. Жыццядзейнасць у населеным пункце не парушана — ёсць аб'язная дарога праз вёску Колкі. Пагрозы жылым дамам і гаспадарчым пабудовам няма. Дарэчы, узровень вады ў рацэ Пціч (прытоку Прыпяці) ля вёскі Лучыцы склаў 326 см (небяспечна высокі — 370 см), назіраецца ледастаў з палонкамі. Раённае падраздзяленне МНС праводзіць пастаянны маніторынг паводкавага становішча.

ШЭКСПІР АДПАЧЫВАЕ

Колькі сродкаў спатрэбіцца, каб пасля пажара завяршыць рэканструкцыю Мазырскага драматычнага тэатра імя І. Мележа, падлічыць спецыяльная камісія

Прынамсі, гістарычны будынак у стылі канструктывізму, здадзены ў эксплуатацыю 80 гадоў таму, апошнім часам ужо знаходзіўся на частковай рэканструкцыі. Хаця вечарам у суботу на сцэне планавалі сыграць спектакль «Трагедыя прынца Дацкага» па п'есе Уільяма Шэкспіра. Тэатр загарэўся каля 14 гадзін дня.

Узгаранне пачалося ў малой глядзельнай зале: менавіта там спрацавала сігналізацыя. Полымя ахапіла частку другога паверха будынка, дзе размяшчаецца малая глядзельная зала. Усе перакрыцці ў будынку драўляныя, што спрыяла распаўсюджванню агню. На тушэнне пажару было накіравана больш за 20 адзінак тэхнікі МНС, і праз паўтары гадзіны пажарныя ліквідавалі ўзгаранне. Значную частку будынка змаглі выратаваць. Агнём знішчаны і значна пашкоджаны дах на плошчы 400 кв.м, маёмасць у майстэрні мастака, двух кабінетах, вестыбюлі на другім паверсе. У будынку, калі ўспыхнуў агонь, знаходзіліся толькі вахцёр і касір. Яны паспелі пакінуць небяспечнае месца.

У прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС паведамілі, што створаная камісіі высвятляюць магчымую прычыну ўзгарання.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Гродзеншчына

ПЕРАМОГА ЦАНОЙ ЗЛАЧЫНСТВА?

Суд Дзятлаўскага раёна прыгаварыў да пяці гадоў абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу механізатара сельгаскааператыва «Граніт-Агра», які наўмысна пашкодзіў тэхніку прадпрыемства.

Жадаючы пераўзысці канкурэнтаў на леташнім жніве і атрымаць буйное матэрыяльнае ўзнагароджанне, восенню 2011 года ён засыпаў стружку ад абразіўнага круга ў гарлавіны маслаправодаў двух камбайнаў John Deere, замацаваных за іншымі механізатарамі гэтай гаспадаркі. У выніку былі пашкоджаны турбіны, масляныя помпы і дэталі рухавікоў: страты ацэньваюцца больш чым у 180 мільёнаў рублёў. Падазраваны спачатку напісаў пратакол яўкі з павінаннем, у прысутнасці калектыву СВК прызнаў сваю віну і да суда нават часткова кампенсаваў прычыненыя страты, але затым ад уласных слоў адмовіўся. Тым не менш следствам былі знойдзены доказы, што пацвярджаюць наўмыснае пашкоджанне ім камбайнаў, паведамляе ўпраўленне Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Магілёўшчына

САЦЫЯЛЬНЫ ЦЫРУЛЬНІК ПРЫЙДЗЕ Ў КВАТЭРУ

Пенсіянерам і інвалідам Першамайскага раёна горада Бабруйска прапануюць танна падстрыгчыся, не выходзячы з дома

Такую паслугу рэкламуе тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва раёна. Аддзяленне тэрміновага сацыяльнага абслугоўвання прапануе прымальныя расцэнкі: мужчынская і жаночая стрыжкі каштуюць 11,1-12,5 тыс. рублёў.

У штаце на палову стаўкі працуе сацыяльны работнік, які мае прафесію цырульніка. Паслуга вельмі запатрабаваная: штодзень выконваюцца дзве-тры заяўкі. Усе кліенты задаволеныя: цырульнік дома можа дапамагчы памыць валасы, пастрыгчы іх і пафарбаваць, пабрыць вусы і бараду мужчынам, зрабіць укладку фенам для свята.

Замовіць сацыяльнага цырульніка на дом можна па тэлефоне ў Бабруйску: 44 18 48.

Ілона ІВАНОВА.

В публикации ОАО «Брестский КСМ» о проведении собрания акционеров (газета «Звязда» № 30 от 15.02.2013 года) следует читать:
1) **очередное общее собрание** и далее по тексту.
2) Время регистрации в день проведения собрания с **12.30 до 13.00.**

У РЭЛІГІЁНЕ

СЛЁЗЫ РОСІЦЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Росіцкую трагедыю нельга забываць. Немагчыма. Пакуль жывуць яе сведкі, пакуль ад пакалення да пакалення пераходзіць вера. Пакуль жыве сама Асвейшчына.

Якраз 70 гадоў таму з росіцкай трагедыі пачалася трагедыя ўсёй асвейскай зямлі. З жудаснага дня, калі фашысцкія акупанты сагналі ў мясцовы касцёл жыхароў Росіцы і навакольных вёсак, а потым, пратрымаўшы некалькі дзён, вывелі на ўскраіну і зажыва спалілі ў вялікім гумне. У той дзень загінула больш за 700 чалавек. Бяда здарылася 16 лютага 1943 года.

Трагедыя Асвейшчыны — адна з самых жудасных старонак вайны на тэрыторыі Беларусі. Карная аперацыя, якую ўчынілі гітлераўскія захопнікі, па жорсткасці пераўзышла ўсе праведзеныя імі дагэтуль акцыі па знішчэнні мірнага насельніцтва. У выніку блакады (а доўжылася яна амаль паўтара месяца) толькі ў колішнім Асвейскім раёне былі спалены ўсе 158 населеных пунктаў, частка з якіх знішчана разам з людзьмі. З 21 тысячы на папялішчы вярнуліся толькі 6 з паловай тысяч колішніх жыхароў. На тэрыторыі Асвейшчыны застаўся ў жывых адзін з трох жыхароў.

І вёска Росіца, і ўвесь Верхнядзвінскі раён жывуць памяццю пра сваіх закатаваных землякоў. Штогод у парафіяльным касцёле Найсвяцейшай Тройцы адбываецца жалобны малебен у іх памяць. Вось і сёлета некалькі соцень вернікаў прыйшлі на пакутнае месца, каб у супольнай малітве прасіць у Бога заступніцтва за росіцкіх ахвяр і ў журботнай працэсіі прайсці той дарогай, па якой пад прымусам ішлі на смерць нявінныя людзі. Вось і зноў тут сабраліся, каб ускласці кветкі і запаліць свечкі каля крыжа, які ўзвышаецца на месцы спаленага з людзьмі гумна.

У гэты дзень у Росіцы ўшаноўваюць і памяць двух каталіцкіх святароў-марыянаў, якія да апошняй хвіліны заставаліся ў касцёле і вялі бесперапынную малітву за выратаванне палонных людзей. Святары не пакінулі вернікаў нават у хвіліну смерці, засталіся з імі ў палаючым гумне.

З суседняй вёскі Ворзава прыйшла ў касцёл і 80-гадовая Валянціна Марцынкевіч. Ёй, цудам ацалелай у дзень росіцкай трагедыі, хочацца дзякаваць Богу за сваё выратаванне і прасіць прабачэння ў землякоў, якіх напаткаў гэткі жудасны лёс. Валянціна Баляслаўна разумее, што і для яе ўсё магло скласціся зусім інакш, што полымя магло паглынуць і яе, дзесяцігадовую ў той час дзяўчынку. Ці гэтак жа, як іншых, у гумне на ўскраіне Росіцы альбо ў сваёй спаленай вёсцы Кулакова, пра якую сёння нагадвае сціплы помнічак. Валянціна Баляслаўна моліцца за загінулага ксяндза Антонія Ляшковіча, да якога ў час вайны яна прыйшла на першую споведзь і атрымала ад яго ружанец. З гэтым ружанцам дзяўчынка прайшла лагер смерці Саласпілс, вытрывала прымусовую працу, ацалела ў час авіябамбёжак. З гэтым ружанцам не развітваецца і сёння, верыць у яго дапамогу.

Сярод удзельнікаў гадавіны трагедыі паломнікаў з Полацка, Наваполацка, Барысава, Мінска было больш, чым сваіх, асвейскіх. Магчыма, таму, што людзям старэйшага ўзросту цяжка прыгадваць тыя жудасныя дні вайны, у якія загінулі іх родныя і блізкія людзі. Цяжка вяртацца ў мінулае нават у думках. А вось Лёля Пляйко з вёскі Сенькава, якая нарадзілася менавіта ў час карных аперацый — у сакавіку 1943 года, усё ж дабралася да Росіцы. Яна ведае пра трагедыю толькі з успамінаў сваёй маці, і таму ёй, напэўна, гэтыя ўспаміны не такія балючыя. Сёння тут, каля памятнага крыжа, і Яніна Маслоўская з вёскі Дуброва, якой ішоў толькі другі гадочак, калі пачалася вайна. Дзякуючы сваёй матулі, якая тры гады вайны хавалася ў лясах і балотах, Яніна засталася жывою. А колькі гэткіх немаўлят было пахавана ў лютаўскія завеі-маразы, адышло ў нябыт у вогнішчах палаючых храмаў і сялянскіх хат?!

Анатоль КЛЯШЧУК.
Фота аўтара.
Верхнядзвінскі раён.

ВОДБЛІСКІ ПЕРАМОГІ:
«Мінскі кацёл» у музейнай экспазіцыі

У мінчан і гасцей сталіцы з'явілася ўнікальная магчымасць на свае вочы пабачыць адзін з драматычных момантаў Вялікай Айчыннай вайны. Апынуцца ў эпіцэнтры аперацыі «Багратыён», стаць сведкам разгрому групы армій «Цэнтр», можна, наведаўшы Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта тут адкрылася батальная дыярама «Мінскі кацёл».

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

З такой дакладнасцю ўзнавіць кульмінацыю бітвы пад Мінскам атрымалася ў маскоўскай Студыі ваенных мастакоў імя М.Б. Грэкава. Далучыліся да дыярамнага мастацтва і маладыя выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Вольга Мельнік-Малахава і Антон Вырва. У музеі ёсць яшчэ адна падобная экспазіцыя. Яна пераносіць наведнікаў у пачатак вайны. **Мастацкі кіраўнік дыярамы «Мінскі кацёл», мастак Павел РЫЖЭНКА** бачыць паміж гэтымі творамі відавочную сувязь:

— Я назваў бы гэтыя дзве дыярамы «Лёс чалавека». У першым творы, які адлюстроўвае пачатак вайны, стары ў роспачы гоніць каня, а падлетак бяжыць наперадзе

бежанцаў, якія, як і ён, яшчэ не разумеюць нічога. На пярэднім плане новай дыярамы адлюстраваны той жа стары, які ўжо прайшоў праз усю вайну, і той жа падлетак, які замест гульні ў вайну ваяваў па-сапраўднаму: ён стаў партызанам. Хлопчык глядзіць увышыню, дзе ляціць наш самалёт, і напэўна, думае пра светлую будучыню, якая чакае яго і ўсю краіну.

Аўтары паказалі не толькі асабістую драму гэтых людзей, у тварах якіх ужо адчуваецца палёгка, радасць хуткай перамогі. Навідавоку трагедыя кожнага салдата, у вачах якіх чытаецца вера ў светлую будучыню. У цэлым, нягледзячы на чорнае воблака дыму ад баёў на заднім плане, вялікая колькасць савецкіх самалётаў у небе і разгромлены нямецкі танк надаюць пазітыўны настрой усёй рабоце.

— Нам была дадзена ўнікальная магчымасць паспрабаваць свае сілы ў дыярамным мастацтве, — расказвае **адзін з мастакоў дыярамы, выкладчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Вольга МЕЛЬНІК-МАЛАХАВА.** — Гэта каласальны вопыт, найцікавейшая праца. На жаль, у Беларусі падобных спецыялістаў не рыхтуюць. Таму супрацоўніцтва са студыяй Грэкава — першыя крокі да стварэння нацыянальнай дыярамнай школы.

Мастакі падышлі адказна да ажыццяўлення творчай задумы. Гістарычныя матэрыялы адпавядаюць рэчаіснасці. Дакладныя ўзоры тэхнікі, узбраення, ваенная вопратка, дакументы... Гукавое суправаджэнне выставы дапамагае зрабіць бітву больш рэальнай. Роў самалётаў, гул танкавых маторай, гук разрываў снарадаў пераносяць гледачоў у ваенныя падзеі.

Як адзначыў **дырэктар музея Сяргей АЗАРОНАК**, дыярама атрымалася вельмі эмацыйнай, перадае псіхалагізм і пачуцці людзей у апошнія дні вайны. «Мастакам было складана лаканічна паказаць гэтую шматгранную падзею на невялікім матэрыяле. Аднак у іх гэта атрымалася».

— Сяргей Іванавіч, ці знойдзецца месца дыяраме ў новым будынку Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны?

— Дыярама размесціць у спецыяльнай зале, дзе будуць апавядаць пра аперацыю «Багратыён». Яна арганічна ўпішацца ў новае памяшканне. Я вельмі задаволены, што ў музеі будуць дзве дыярамы, якія адлюстроўваюць падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта вельмі высакаякасныя творы! Не нейкія копіі ці інсталяцыі, а новы крок у музейнай справе, што яшчэ лепш. Я вельмі спадзяюся, нашы маладыя мастакі, якія пачынаюць працаваць у рамках дыярамнага мастацтва практычна на адным узроўні з рускімі калегамі, змогуць ствараць падобныя творы і ў іншых музеях краіны. Гэта вельмі здорава, што адраджаецца такая форма музейнай працы, якую часта называюць «сярэднявечным 3D».

Як падкрэсліў Павел Рыжэнка, дыярама была створана для людзей, якія не па чутках ведаюць, што такое вайна. «Гэтай працай мы яшчэ раз паспрабавалі ўвекавечыць подзвіг ветэранаў і нагадаць моладзі, якой цаной была здабыта Перамога».

Вераніка КАНЮТА.

Сяргей КАРНЕЕЎ:

■ Напярэдадні

ДОМА ДАПАМАГАЮЦЬ СЦЕНЫ? ПРАВЕРЫМ!

Беларусь рыхтуецца прыняць яшчэ адзін буйны спартыўны форум. На мінулым тыдні быў падпісаны кантракт на правядзенне ў Мінску чэмпіянату Еўропы па боксе. Кантынентальнае першынство пройдзе ў беларускай сталіцы з 30 мая па 9 чэрвеня.

На цырымонію спецыяльна прылятаў прэзідэнт Еўрапейскай канфедэрацыі бокса Франка Фалчынэлі, які застаўся задаволеным інфраструктурай горада: «Для правядзення спаборніцтваў мы выбралі Палац спорту. Тут можна ўсталяваць два рынгі, ёсць усё неабходнае, у тым ліку і трэніровачныя залы. Да таго ж арэна кампактная і вельмі зручна размяшчаецца ў цэнтры горада. Побач ёсць гасцініцы, дзе будуць пражываць удзельнікі спаборніцтваў. Ведаю, што ў Беларусі бокс папулярны, таму ўпэўнены: чэмпіянат пройдзе пры поўных трыбунах».

На хатнім турніры беларускія баксёры спадзяюцца ўзяць медалі ў пяці вагавых катэгорыях. Аднак на першынство наша краіна выставіць поўную каманду з дзесяці чалавек. Нягледзячы на тое што канчатковы склад зборнай будзе сфарміраваны па выніках Кубка Беларусі, які пройдзе ў сакавіку, некаторыя месцы ў камандзе ўжо занятыя. Так, змагацца за медалі ў Палацы спорту дакладна будуць удзельнікі лонданскай Алімпіяды Вазген Сафар'янц, Міхаіл Даўгалевец, Сяргей Карнееў, а таксама сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў-2004 Віктар Зуеў.

Карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да будучых удзельнікаў еўрапейскага чэмпіянату ў Мінску, каб даведацца, чаго яны чакаюць ад хатняга старту: «Безумоўна, прыемна, што нашай краіне выпаў гонар правесці турнір такой велічыні, — распавядае **прызёр чэмпіянату свету па боксе-2011 Сяргей КАРНЕЕЎ.** — У 1998 годзе ў Мінску ўжо праходзіў чэмпіянат Еўропы. Я быў пастаянным гледачом турніру, на трыбуны

мяне прыводзіў тата. Дагэтуль памятаю, як заўзята я «хварэў» за тых баксёраў. З адным з іх я трэніруюся цяпер! Гэта Сяргей Хаміцкі. На тым чэмпіянаце Еўропы ён стаў пятым. У баі за медаль яго засудзілі. Быў такі ажыятаж! Так несправядліва паступілі з земляком у сябе ж дома. На Алімпіядзе я сам сутыкнуўся з аналагічнай сітуацыяй, таму ведаю, наколькі гэта крыўдна. Спадзяюся, што праз пятнаццаць гадоў еўрапейскае першынство ў Мінску пройдзе сумленна, прыгожа і справядліва. Што датычыцца падрыхтоўкі, то ўсё ідзе поўным ходам. Вельмі хочацца добра выступіць і заваяваць медалі. Кажуць, дома і сцены дапамагаюць. Што ж, праверым».

Яшчэ адзін член зборнай Міхаіл Даўгалевец адзначыў, што збольшага правядзенне ў Мінску спаборніцтваў такога маштабу — заслуга аднаго чалавека: «Нельга апісаць словамі, наколькі чэмпіянат Еўропы ў Мінску — значная падзея для беларускага бокса. Гэта стала магчыма старанні старшыні нашай федэрацыі Дзмітрыя Паўлавіча Ціхамолава, за што яму нізкі паклон. Ахвотных правесці гэты турнір было вельмі шмат, але менавіта ў Мінску збяруцца найлепшыя баксёры Еўропы. Падрыхтоўка ідзе добра, але да мая яшчэ шмат часу і наперадзе прамежкавыя турніры, таму я стараюся пакуль не думаць толькі пра гэты старт».

Зараз беларуская каманда знаходзіцца на зборах у Балгарыі і Венгрыі, дзе нашы спартсмены трэніруюцца з баксёрамі Кубы, Францыі, Кітая, Азербайджана. Акрамя гэтага, дзеля якаснай падрыхтоўкі на наступны алімпійскі цыкл галоўным трэнерам нацыянальнай каманды быў назначаны спецыяліст з Узбекістана Уладзімір Шын, які ў свой час трэніраваў такіх чэмпіёнаў, як Руслан Чагаеў і Алег Маскаеў. Умовы ёсць — усё залежыць ад спартсменаў. Што з гэтага атрымаецца, пабачым праз тры месяцы.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

МІНСКАЕ «ДЫНАМА» НЕ ТРАПІЛА Ў ПЛЭЙ-ОФ КАНТЫНЕНТАЛЬНАЙ ХАКЕЙНАЙ ЛІГІ

Апошнім часам айчынны хакей ліхаманіць. Спачатку зборная Андрэя Скабелкі не прайшла кваліфікацыю Алімпіяды ў Сочы, мінскае «Юнацтва» ў адкрытым першынстве Вышэйшай хакейнай лігі саступіла камандзе «Кубань» з буйным лікам — 0:9. У сваю чаргу, мінскае «Дынама» таксама пакінула сябе і заўзятараў без чаканай стадыі плэй-оф Кубка Гагарына.

У апошніх сустрэчах рэгулярнага першынства хлопцам Аляксандра Андрыеўскага неабходна было паспяхова згуляць на «Мінск-Арэне» з казанскім «Ак Барсам» і ўфімскім «Салават Юлаевым». Здавалася, родныя сцены, камфортнае турнірнае становішча, якое дазваляла спадзявацца на далейшую барацьбу за ўзнагароды — усё гэта не прымушала моцна хвалявацца заўзятараў перад апошнімі сустрэчамі. Шкада, але атрымалася ўсё наадварот. Спачатку мінчане ў напружанай барацьбе саступілі «барсам» 2:3, а пасля з такім лікам прайгралі і «Салавату». «Атлант» з Мыцішчаў, адзін з асноўных канкурэнтаў беларусаў за плэй-оф, у той жа час пераканаўча перамог новакузнецкі «Металург» (5:0) і заняў жаданае 8-месца ў нашай канферэнцыі. Нашы хлопцы апынуліся на выніковай 10-й пазіцыі.

Тарас ШЧЫРЫ.

КІРОЎЦУ, ЯКІ ЗБІЎ ДЗІЦЯ КАЛЯ МІНСКАЙ ШКОЛЫ, АГУЧАНЫ ПРЫСУД

Учора суд Фрунзенскага раёна Мінска прыгаварыў 37-гадовага кіроўцу «Паршэ Каена», пад коламі аўтамабіля якога загінуў вучань 3 класа, да 4 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах пасялення і да 5 гадоў пазбаўлення права кіравання транспартным сродкам. Мужчына прызнаны вінаватым у парушэнні правілаў дарожнага руху, якое пацягнула смерць чалавека па неасцярожнасці.

Акрамя таго, суддзя вынесла прыватную пастанову аб ненależным кантролі за парадкам на прылеглай да школы тэрыторыі. Адпаведнае прадстаўленне будзе накіравана начальніку ўпраўлення адукацыі Фрунзенскага раёна Мінска.

Паводле слоў пракурора, вадзіцель кіраваў аўтамабілем — крыніцай павышанай небяспекі і павінен быў разумець сваю адказнасць. Абвінаваўца палічыў доказы па гэтай справе (расследаваннем займаўся цэнтральны апарат Следчага камітэта) поўнымі і аб'ектыўнымі, вынікі праведзеных экспертыз у яго не выклікалі сумненняў. Пацярпелы бок — маці загінулага хлопчыка, яго бабуля і дзядуля — ад свайго слова адмовіўся, пры гэтым патлумачыўшы, што цалкам згодны з абвінавачаннем.

Сам жа падсудны не прызнаў сябе вінаватым ні па адным з пунктаў абвінавачання, прад'яўленага пракурорам. «Я прызнаю сваю маральную віну. Мой лёс і лёс хлопчыка перапляліся выпадковым, трагічным чынам. Я не злачынца, не забойца. Прашу прабачэння ў маці, бабулі, дзядулі і ўсіх сваякоў дзіцяці», — сказаў бацька дваіх дзяцей (2 і 5 гадоў) падчас свайго апошняга слова ў зале суда.

Трагедыя адбылася 13 лістапада гэтага года каля 19 гадзін вечара на тэрыторыі школы №23 па вуліцы Панчанка ў Мінску. У той вечар, калі падсудны, намеснік гендырэктара двух прыватных прадпрыемстваў са стажам кіравання больш чым 12 гадоў збіў 9-гадовага хлопчыка, каля будынка школы было прыпаркавана прыкладна 20 машын (згодна з ПДР, рух па мясцовым праездзе каля школы дазволены толькі для спецтранспарту, а паркоўка наогул забаронена), у школе праходзіў бацькоўскі сход. Рашэнне суда можа быць абскарджана на працягу 10 дзён.

Надзея ПАЎЛАВА.

І ДАР'Я З ВІКТОРЫЯЙ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А хто насамрэч адначасова здзівіў і ўсцешыў — Дар'я Домрачава. Чарговы чэмпіянат свету па біятлоне, які прымала чэшскае Новэ-Места, на жаль, не заладзіўся ў яе з самага пачатку. Даша ніяк не магла намацаць былы тэмп, пераможны рытм, ад якога шалелі айчынныя прыхільнікі страляючых лыжнікаў. Многія заўзятары не разумелі, што здарылася з біятланісткай, а нехта наогул неразважліва паспеў паставіць на ёй крыж у гэтым сезоне. Але Домрачава прадэманстравала волю, характар і наперакор усім цяжкасцям вярнулася на залаты п'едэстал. У апошнім старце чэмпіянату свету, мас-старце, яна, як і яе галоўная саперніца Тура Бергер, зрабіла два промахі, аднак здолела атрымаць перамогу.

— Кожная цяжкая сітуацыя даецца чалавеку для таго, каб ён зрабіў вывады, — разважала ўжо пасля гонкі Дар'я Домрачава. — Гэтыя гонкі навучылі мяне быць яшчэ больш моцнай.

Верым у гэта, перажываем і спадзяёмся. Поспехаў, дзяўчаты!

Тарас ШЧЫРЫ.

«Не трэба ні з кім канкурыраваць. БЫЦЬ НА КРОК

У ткацкім цэху № 9. На гэтых станках працуе ткачыха Галіна БЕЗУХ.

ААТ «Полацк-Шкловалакно» сёлета адзначыць сваё 55-годдзе

Размотчыца Алена ФОКІНА.



Такія шкляныя празрыстыя шарыкі ў цэхах прадпрыемства пераўтвараюцца ў высакаякаснае, трывалае шкловалакно.

З карэспандэнтамі «Звязды» гутарыць генеральны дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства Мікалай КАЧАНОЎСКІ.

— Паважаны Мікалай Аляксандравіч, кожны свой працоўны дзень вы пачынаеце з наведвання вытворчасці. Сёння раніцай затрымаліся ў цэхах надоўга. Калі не сакрэт, якія аператыўныя задачы вырашалі?

— Перш за ўсё на месцы разгледзелі канкрэтныя пытанні тэхнічнага пераўзбраення. Зараз ідзе мантаж новых ткацкіх станкоў у дзявятым цэху, і хоць усё было зараней прадумана і спланавана, узнікаюць выключна рабочыя моманты. Паступае таксама прагрэсіўнае абсталяванне для фінішных аперацый у восьмы цэх — разам з яго кіраўніцтвам пракантралявалі, наколькі хутка і якасна вядзецца падрыхтоўка плошчаў пад яго. На вытворчасці шклапластыкавых вырабаў народнага ўжытку абмяркоўвалі бліжэйшыя перспектывы з пункту гледжання асартыменту— у якіх кірунках будзем далей развівацца. Заадно вырашалі наспеўшыя кадравыя пытанні. Гэты кірунак сваёй работы будзем адчувальна ўзмацняць, бо ад забяспечанасці кадрамі залежыць вельмі многае.

Да слова сказаць, кадравая праблема ў нас абвастрылася. Яшчэ і таму, што з вялікімі складанасцямі камплектуецца базавы каледж хімікаў, і пытанне патрэбна вырашаць комплексна, агульнымі сіламі з сістэмай адукацыі і службамі занятасці насельніцтва. А пакуль дабіраем людзей, што называецца, з вуліцы. Сваю ролю адыграў. А гэта не так лёгка, бо ў моладзі іншае бачанне жыцця, крыху іншыя запатрабаванні...

— Калі ласка, хаця б коратка пракаментуйце вынікі мінулага года.

— Ён не быў нейкім паказальным для калектыву (у адрозненне ад папярэдняга). Можна сказаць, што разам з сусветнай эканомікай мы ўсё яшчэ выходзілі з нядаўняга сістэмнага крызісу. Больш за 85 працэнтаў сваёй прадукцыі пастаўляем на экспарт, таму хочаш ці не, але акцыянернае таварыства трывала «ўманціравана» ў сусветную эканоміку. І ўсе тэндэнцыі ў ёй сваім крылом закранаюць прадпрыемства. Нават лакальны крызіс ці збой у асобна ўзятай краіне, у той ці іншай галіне адбіваецца на нас. У прыватнасці, пачало «прытарможваць» сусветнае машынабудаванне, і мы мусілі збавіць абароты на знешніх рынках. На ўнутраным са спазненнем пачаўся будаўнічы сезон, будаўнікі краіны ўвогуле пабудавалі менш жылля, чым пазалетась, а мы пастаўляем прадукцыю для гэтай галіны, у кожным доме прысутнічаюць нашы матэрыялы.

І ўсё ж нягледзячы на крызісныя з'явы на асноўных рынках збыту, нам удалося выканаць свае абавязацельствы перад пакупнікамі і забяспечыць іх неабходнай прадукцыяй. Справіліся не з усімі прагнознымі паказчыкамі, але важна, што захавалі аб'ёмы вытворчасці, нават нарасцілі іх.

У прыватнасці, крыху недавыканалі прагназуемы экспартны паказчык, які вызначаўся «ад дасягнутага». Перад гэтым (у 2011 годзе да 2010-га) экспарт нарасцілі на 16 працэнтаў.

Каб утрымацца на сусветных рынках, канкурыраваць з вядучымі вытворцамі, нам давялося весці гібкую палітыку, у тым ліку зніжаць цану на сваю прадукцыю. Бо ў рынкавай эканомікі свае законы, і адзін з іх — аператыўнае рэагаванне на хістанні тавараў і цаны.

За рынкамі ўвогуле патрэбна сачыць увесь час і аператыўна рэагаваць на змяненне кан'юнктуры. Напрыклад, мы ў нядаўнім мінулым часова адмаўлялися ад ткацтва і больш увагі надавалі прадукцыі, якая была на той момант запатрабавана — ровінгам, сечанаму валакну, ніцям таварным. Зараз вярнуліся да ткацтва, ткацкі цэх працуе з поўнай загрузкай. Ідзе яго мадэрнізацыя. Ставім найбольш сучаснае абсталяванне, якое цяпер выпускаецца ў свеце, — японскае.

Надаём надзвычай вялікую ўвагу далейшаму ўдасканаленню тэхналогіі з тым, каб усю прадукцыю вывесці на цалкам сучасны высокі ўзровень і адчуваць сябе больш абароненымі на знешніх рынках. Гэта актуальна, бо той жа Кітай, які з'яўляецца заканадаўцам моды ў нашым сектары рэальнай эканомікі, пастаўляе проста фантастычныя аб'ёмы прадукцыі. І мы можам утрымацца сваю нішу толькі дзякуючы разумным суадносінам цаны і якасці. А таксама ўменню апынуцца са сваёй прадукцыяй у патрэбным месцы і ў патрэбны час.

А наогул, калі гаварыць шчыра, мы імкнёмся нават не канкурыраваць — у звыклым сэнсе. У ідэале не трэба ні з кім канкурыраваць, трэба са сваёй прадукцыяй быць на крок наперадзе. Нехай нас даганяюць. Мы павінны сёння рабіць тое, аб чым іншыя толькі думаюць. І пакуль такая стратэгія дзейнічае, прыносіць поспех.

— Ваш калектыў заўсёды вызначала ўменне бачыць новыя гарызонты. З чым звязваеце перспектывы, Мікалай Аляксандравіч?

— З далейшым развіццём асноўных кірункаў сваёй дзейнасці і стварэннем новых. У прыватнасці, з запускам экспартаарыентаванай вытворчасці канкурэнтаздольных тонкіх электраізаляцыйных і канструкцыйных матэрыялаў (кошт праекта — 27 з лішнім мільярдаў рублёў).

Мы істотна пашырылі аб'ёмы выпуску шкловалакна. Перанеслі яго вытворчасць з цэнтра горада на сваю асноўную пляцоўку на вуліцы Будаўнічай — раней гэта лічылася прамысловай зонай Ксты. І зараз патрэбна развівацца далей — мадэрнізаваць наша тэхналагічнае абсталяванне, на якім ажыццяўляюцца наступныя тэхналагічныя пераходы: размотка шкляной ніці, сноўка, шліфтоўка, ткацтва... Мадэрнізаваць само ткацкае абсталяванне, каб новыя аб'ёмы шкляной ткані былі толькі сусветнай якасці.

Гэта важна яшчэ вось чаму. З уступленнем Расіі ў СГА (ВТО) туды пойдзе прадукцыя з усіх краін свету без мытных пошлін, канкурэнцыя ўзрасце. А мы ў Расію адпраўляем больш чым палову сваёй прадукцыі — гэта асноўны яе спажывец. І каб там адчуваць сябе ўпэўнена, патрэбна пастаўляць якасную і параўнальна танную прадукцыю.

Такія задачы на бліжэйшую перспектыву. А ў наступныя гады — 2014-ы і 2015-ы — мы павінны давесці да ладу цэхі фінішнай апрацоўкі прадукцыі, выканаць там мадэрнізацыю абсталявання. Калі дакладней, то замяніць лініі ў фінішных цэхах і пабудаваць новы вытворчы корпус для цэха матэрыялаў спецыяльнага прызначэння.

Прыступаем да рэалізацыі даволі буйнога праекта, завяршыць які павінны ў 2014 годзе — арганізацыі вытворчасці канструкцыйных шкламатаў (CSM) з сечанага валакна. Гэты від прадукцыі выкарыстоўваецца пры вытворчасці шклапластыкавых вырабаў у якасці арміравальнага матэрыялу і пастаўляецца ў Беларусь толькі па імпарце з Кітая і Еўропы. Так што вытворчасць шкламатаў з рассыпнога шкларовінгу робіць гэты кірунак імпартазамяшчальным, а новыя тэхналогіі пасадзейнічаюць павелічэнню глыбіні перапрацоўкі айчыннай сыравіны.

Такім чынам, у выніку ўсіх мерапрыемстваў, якія праводзяцца, ужо ў недалёкай перспектыве мы павінны выйсці на новы ўзровень гарантавана высокай якасці прадукцыі, выпуску новых яе відаў. Рыхтуем перадумовы для таго, каб у далейшым увогуле займацца больш глыбокай перапрацоўкай сваёй прадукцыі і выпускам не толькі сыравіны ці паўфабрыкатаў для іншых таваравытворцаў, але і цалкам гатовых вырабаў, у тым ліку тавараў шырокага ўжытку, будаўнічых матэрыялаў.

— Некалькі слоў, калі ласка, пра ваш сельскагаспадарчы філіял. Як працуецца вашым аграрыям?

— Ураджайнасць летась была адна з найбольш высокіх у раёне. І па надоях сітуацыя складваецца няблага. Канечне, не абыходзіцца без фінансавых уліванняў з нашага боку. Выканалі там рэканструкцыю малочнатаварнай фермы. Будуецца сучасная даільная зала. Дапамагаем з закупкай тэхнікі, элітнага насення, вырашаем іншыя пытанні. Там нармальны кіраўнік, які ўмела клапоціцца пра канкрэтныя вынікі, ды і землі нядрэнныя. Але якая б зямля ні была, усё роўна за ёю патрэбен догляд. Таму ўлічваем рэкамендацыі спецыялістаў і стараемся, каб гаспадарка была ў ліку перадавых.

Падводзячы вынік гутаркі, Мікалай Аляксандравіч Качаноўскі зазначыў:

— Гэты год таксама не абяцае быць лёгкім, спатрэбіцца працаваць на поўную сілу, з творчым падыходам. Задачы на яго стаяць зусім іншыя — па мадэрнізацыі вытворчасці, па павелічэнні выпрацоўкі на аднаго чалавека, наогул па далейшым павышэнні прадукцыйнасці. Аб'ёмны паказчык павінен яшчэ больш узрасці. Спадзяюся, што 2013 год увойдзе ў нашу гісторыю як пераломны. Калі мы яго адпрацуем паспяхова, далей стане лягчэй, бо з кожным годам будзем аддаляцца ад крызісу.

Што прынёс Год якасці?

Начальнік службы якасці Святлана САЎЧАНКА.

— Яшчэ ў жніўні 2011 года генеральны дырэктар сваім загадам зацвердзіў, як мы яе называем, палітыку трох сістэм. У адзіную сістэму былі інтэграваны сістэма менеджменту якасці (пры зліцці прынята за базавую), сістэма аховы працы і прамысловай бяспекі і аховы навакольнага асяроддзя. Такім чынам, мы сфармулявалі агульную палітыку. Спатрэбілася правесці вялікую работу па стварэнні агульных стандартаў, па ўнутраным аўдыце, кіраванні дакументацыяй, у тым ліку кіраванні запісамі, якія павінны быць адзінымі для трох сістэм. Яны перагледжаны і актуалізаваны менавіта з пункту гледжання інтэгравання, выпрацаваны адзіныя падыходы. Сертыфікацыю зараз праходзім адразу па трох сістэмах.

2012 год быў аб'яўлены на прадпрыемстве Годам якасці. У аснову даволі насычаных мерапрыемстваў паклалі запатрабаванні спажыўцоў. Можна сказаць, што новым кірункам стала работа па набліжэнні нашых стандартаў да сусветных. Гэта датычыцца перш за ўсё электраізаляцыйных тканін, з 1 студзеня 2013 года на гэтыя тканіны ў нас дзейнічаюць новыя патрабаванні, якія адпавядаюць міжнародным.

У далейшай рабоце плануем правесці аўдыт пастаўшчыкоў. Гэта таксама новы і даволі перспектыўны з пункту гледжання эфектыўнасці кірунак работы. Яшчэ і таму, што такія непасрэдныя кантакты з пастаўшчыкамі даюць багаты вытворчы вопыт.

Кантроль прадукцыі ў акцыянерным таварыстве базіруецца на прынцыпах забеспячэння якасці кожным выканаўцам на кожным рабочым месцы. Каб механізм працаваў, вядзецца бесперапынная падрыхтоўка персаналу. Для рабочых гэта павышэнне кваліфікацыі, перападрыхтоўка, стажыроўка і самаадукацыя. У праграмы па навучанні ўключаны і патрабаванні стандарту ISO. Падыход такі: спачатку навучыць, а ўжо потым патрабаваць.

Для найбольш поўнага выкарыстання патэнцыялу работнікаў, падтрымкі ў калектыве адкрытых і сумленных узаемаадносін у акцыянерным таварыстве функцыянуе сістэма самакантролю якасці прадукцыі. Рабочы, які працуе на самакантролі, штомесяц атрымлівае даплату. Зараз гэта прыкладна 200 тысяч рублёў. І справа нават не ў даплаце. Такі давер павышае статус чалавека сярод таварышаў, у калектыве і нават сям'і, ды і ў асабістых вачах. «Мне давяраюць, і я не маю права падвесці». У сваю чаргу, начальнікі цэхаў вельмі патрабавальна падыходзяць да таго, каму даць такое права.

На гэты год задачы не менш важныя. Па-першае, пацвярджэнне сістэмы менеджменту якасці патрабаванням ICO 9001. Наша праграма па якасці даволі вялікая: летась яна ўключала ў сябе 82 пункты. Яна і зараз уключае некалькі найважнейшых раздзелаў — у тым ліку навучанне персаналу, удзел прадпрыемства ў конкурсах па якасці, якія праводзяцца ў рэспубліцы, пытанні ўдасканалення тэхналогіі і г.д.

Адным з важнейшых кірункаў дзейнасці службы якасці з'яўляецца аналіз зваротаў спажыўцоў, адсочванне іх задаволенасці якасцю нашай прадукцыі. У выніку пастаяннага аналізу зваротаў выяўляюцца нейкія заканамернасці, што дазваляе аператыўна вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць. Калі, дапусцім, было пажаданне па змяненні маркіроўкі аднаго віду прадукцыі, то мы пераглядаем блок пытанняў, звязаных з маркіроўкай усіх яе відаў. Гэта значыць, размова ідзе не толькі аб павышэнні тэхнічных характарыстык выпускаемага асартыменту і не толькі аб безумоўным выкананні патрабаванняў тэхналогіі, якая пастаянна ўдасканальваецца, але ў комплексе — у тым ліку аб сучасным дызайне прадукцыі і яе ўпакоўкі і гэтак далей.

Перааснашчаем парк прыбораў для нашых лабараторый, набываем самае сучаснае абсталяванне. Заказалі новыя разрыўныя машыны — для праверкі тканін на разрыў. Закупкі новага вытворчага абсталявання таксама прадугледжаны праграмай па якасці. Вам, відаць, ужо называлі статыстыку: за апошні час на вытворчасці з'явілася амаль 80 новых станкоў. Старыя выпрацавалі свой рэсурс, таму ідзе актыўнае абнаўленне станочнага парка.

Кожны аўторак пытанні якасці прадукцыі ў комплексе з ходам выканання вытворчай праграмы разглядаюцца на аператыўнай нарадзе ў генеральнага дырэктара. А кожную сераду на прадпрыемстве праходзіць «Дзень якасці». Задзейнічаны ўсе службы, прысутнічаюць прадстаўнікі ўсіх цэхаў, бо работа па ўдасканаленні канечнага прадукту вядзецца скаардынавана. Пасля чаго яны ажыццяўляюць агульную палітыку, агульныя выпрацаваныя падыходы, распараджэнні генеральнага дырэктара ў сябе на вытворчасці.

За плячыма ў Дзмітрыя ПРЫГОЖАГА працоўны шлях ад рабочага да начальніка змены.



Так выглядае ўчастак цэха № 6, дзе ўстаноўлена новая высокапрадукцыйная печ. На пярэднім плане шклавар Алег РАГАЧОЎ.

Начальнік змены Валерый ВОЛКАЎ.

Мадэрнізацыя, якая доўжыцца больш чым паўвека

Расказвае Святлана МООР, начальнік аддзела капітальнага будаўніцтва.

(Крыху раней Святлана Міхайлаўна працяглы час выконвала абавязкі намесніка генеральнага дырэктара па будаўніцтве, так што яна абсалютна дасведчаны чалавек.)

— Мы адказваем за выкананне плана інвестыцый. Аддзел непасрэдна займаецца капітальным і бягучым рамонтам вытворчых і адміністрацыйнага будынкаў, новым будаўніцтвам, мадэрнізацыяй цэхаў. Наша задача: прыйшло новае абсталяванне — устанавіць яго, падвесці камунікацыі.

Такая работа вядзецца пастаянна. Новыя высокапрадукцыйныя ткацкія станкі Toyota і Tsudakoma, стойкі для іх, іншае японскае, чэшскае, бельгійскае абсталяванне прыбывае на прадпрыемства ледзьве не штодня. Удзельная вага новага абсталявання ў агульным плане інвестыцый складае прыкладна 70 працэнтаў.

А ўсяго інвестыцый асвоілі летась на 60 з паловай мільярдаў рублёў (з іх 42 мільярды — уласныя сродкі прадпрыемства, астатняе — крэдыты банкаў).

З найбольш важкіх праектаў мінулага года можна зноў жа ўспомніць рэканструкцыю шкло-плавільнай печы № 1 у сёмым цэху (яна абышлася прадпрыемству ў 16 з паловай мільярдаў рублёў, але прынясе значны эканамічны эфект, бо менавіта печы спажываюць больш за ўсё энергарэсурсаў. Спальванне газу скароціцца на 30 працэнтаў).

Можна назваць таксама ўчастак кандыцыянавання ніці. Пачаліся работы на аб'ектах комплексу ачышчальных збудаванняў. Мы пакуль карыстаемся ачышчальнымі збудаваннямі «Паліміра». Гэта даволі дорага, так што ўзводзім свае.

Пастаўлена мэта арганізаваць поўную перапрацоўку прамысловых стокаў. Пасля ачысткі яны будуць вяртацца ў тэхналагічны ланцужок як тэхнічная вада. Гэта дазволіць палепшыць экалогію і знізіць затраты на вытворчасць прадукцыі. Абсталяванне ўжо закуплена.

Варта нагадаць, што два гады таму мы пабудавалі новую вялікую печ для шостага цэха, якая сама па сабе з'яўляецца буйным вытворчым комплексам. Аб'ект каштаваў 130 мільярдаў, і гэта яшчэ ў цэнах, калі долар быў у 2,5 раза больш важкім.

Праектуем новыя магутнасці для 4 цэха — па фінішнай апрацоўцы тканін кіслатой. Зараз архітэктурны праект знаходзіцца ў стадыі ўзгаднення. Спадзяёмся ў чацвёртым квартале прыступіць да будаўніцтва. Дзеючае абсталяванне будзе заменена на новае, дзякуючы чаму значна вырасце выпуск прадукцыі.

І закупляем новае абсталяванне для сноўкі-шліфтоўкі. Яно ўжо аплачана, ідзе да нас з Кітая.

Неабходна проста НАПЕРАДЗЕ»

Самая буйная ткацкая фабрыка Еўропы

Снавальшчыцы Наталля КРЫШТАПЁНАК і Ілона МАРОЗАВА працуюць на складаным абсталяванні.

Слова — намесніку генеральнага дырэктара па рэалізацыі прадукцыі Ігару ЗАЛЕСКАМУ.

— Пачну з галоўнай, бадай, прыкметы часу. Каб працаваць больш паспяхова, пашыраем рынкі рэалізацыі. Дынаміка відавочная. 2012 год быў самым паспяховым па колькасці краін, у якія адгружалася прадукцыя, — 46. Геаграфія змянілася, бо некалькі знізіліся пастаўкі ў Еўропу, і мы пачалі працаваць на новыя для сябе рэгіёны — Швецыя, Чылі, Пакістан, Сірыя... Распрацавалі праграму па асваенні новых рынкаў, асноўнымі кірункамі выбралі краіны Лацінскай Амерыкі. Зараз сфера нашых інтарэсаў — Аргенціна, Бразілія, Калумбія, Перу, і сітуацыю на рынках гэтых краін адсочваем уважліва.

Толькі летась правялі 700 дзелавых перамоў. Атрымліваецца па дзве перамоў у суткі. Як бачыце, наша актыўнасць высокая.

Шукаем выхады на рынкі Усходняй Азіі. Павялічваем пастаўкі ў Аўстралію, Японію, Карэю — гэтыя рынкі лічым знакавымі.

І ўсё ж асноўным нашым, прыярытэтным партнёрам застаецца Расія, найбольшыя аб'ёмы нашых паставак — менавіта на расійскі рынак, і яны ўзрастаюць.

Існуюць розныя методыкі вывучэння рынкаў, мы імі шырока карыстаемся. Першыя кантакты з пакупнікамі ажыццяўляе інфармацыйная група, яна збірае звесткі, у тым ліку аб новых зваротах, новых кліентах і гэтак далей. Ва ўпраўленні рэалізацыі аналіз вядзецца па асартыменце, па тавараных групах — на ўсіх рынках. А ўжо спецыялісты ўпраўлення маркетынгу вывучаюць увесь масіў інфармацыі, вызначаюць тэндэнцыі і даюць канкрэтныя прапановы па тактыцы паводзін на рынках у канкрэтны адрэзак часу і стратэгіі далейшага развіцця прадпрыемства. У тым ліку робіцца прагноз па новых відах прадукцыі, якія могуць быць запатрабаваны.

складанай сітуацыі. Італія знізіла продаж аўтамабіляў на 20 працэнтаў — гэта самы нізкі ўзровень продажу за 33 гады. У Францыі паказчык знізіўся на 14 працэнтаў — самы дрэнны паказчык з 1997 года. Іспанія дала мінус 13 працэнтаў — горшы паказчык з 1989 года. «Рэно» — мінус 27,7 працэнта, «Пежо-Сітраен» — мінус 16 працэнтаў. Летась «Фіят» зменшыў продаж прадукцыі на 13 працэнтаў...

Як павінны сябе паводзіць мы, пастаўшчыкі прадукцыі для аўтамабілебудаўнічых канцэрнаў свету? Ужо зараз вывучаем стандарт Е-6 па бяспецы еўрапейскіх аўтамабіляў, які будзе ўведзены з 1 студзеня 2015 года, і рыхтуем пад яго прадукцыю. Не важна, што яны зараз «праваліліся» — за падзеннем будзе ўзлёт. А мы працуем з усімі вытворцамі машын вядомых марак. У кожным аўтамабілі шклотканіна выкарыстоўваецца

Начальнік цэха № 6 Алег КРЫВЕЦ — «Чалавек года Віцебшчыны».

Вольгу ХАДЫКУ ведаюць як вопытнага хіміка.

У Года беражлівасці свая логіка

Намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы Алена САВІЦКАЯ.

— Сапраўды, 2012-ы можна лічыць усё яшчэ годам выхаду з крызісу. Характэрна, што мы выканалі большую частку даведзеных паказчыкаў, па крайняй меры, тыя, якія сведчаць аб эфектыўнасці работы прадпрыемства — а гэта рэнтабельнасць, рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, прыбытак. Яны прырастаюць да мінулага перыяду.

Размер прыбытку быў дастатковым, каб мы выканалі калектыўны дагавор, утрымлівалі аб'екты сацыяльнай сферы. А іх у нас восем — паліклініка, прафілакторый, лагер для аздараўлення дзяцей... Нічые інтарэсы не ўразаліся.

У нас былі і сродкі на павелічэнне заработнай платы. А праграма мадэрнізацыі дазволіла павялічыць прадукцыйнасць, нарасціць вытворчыя магутнасці.

У Год беражлівасці шукаем шляхі для істотнага зніжэння сабекошту прадукцыі — гэта для нас актуальна. Працуем над тым, каб зменшыць затраты. Ёсць спецыяльныя мерапрыемствы, якія даюць эфект. Перш за ўсё ў плане матэрыялаёмістасці і энергаёмістасці. Напрыклад, у структуры затрат значная доля паліўна-энергетычных рэсурсаў (каля 30 працэнтаў), і маецца на ўвазе ўстаноўка менш энергаёмістага абсталявання.

З таго, што ўжо робіцца прыкметнага, можна адзначыць менавіта закупку менш энергаёмістых станкоў. Скажам, замянілі 20 адзінак станкоў РАПІД на JAT для вытворчасці электраізаляцыйных тканін. Значны эфект далі таксама рэканструкцыя шклаварнай печы № 1 з заменай гарэлак, пракладка дадатковага трубаправода сціснутага паветра, выкарыстанне сучасных зварачных апаратаў, мадэрнізацыя сістэмы асвятлення, рэканструкцыя лініі ХТМ у цэху № 4, прымяненне так званай вострай пары для нагрэву кіслотных растворaў, устаноўка энергаэфектыўнага кампрэсара і гэтак далей.

Спадзяёмся, што значны эфект прынясе ўкараненне аўтаматызаванай сістэмы комплекснага ўліку энергарэсурсаў, якая дазволіць бачыць карціну іх спажывання ў вытворчых падраздзяленнях.

З усяго пераліку выпускаемай прадукцыі найбольш эфектыўнымі для нас з'яўляюцца крэменязёмныя асартыменты. Але выпускаем не толькі высокарэнтабельную, але і сярэднерэнтабельную прадукцыю, бо яна патрэбна спажыўцу. Ніжэй за сабекошт стараемся не прадаваць. Калі такая прадукцыя з'яўляецца, адразу распрацоўваем мерапрыемствы па зніжэнні затрат на яе выпуск.

У нас ёсць аддзел аналізу, найбольш вопытныя яго работнікі займаюцца аналітычнай работай, штомесяц рыхтуем свае прапановы па эканоміі — што зараз, што на будучае. Кіраўніцтва да гэтых прапаноў прыслухоўваецца.

У гэтым годзе арыентуемся ў сваёй дзейнасці зноў жа не на аб'ёмныя паказчыкі, а на тыя, якія характарызуюць эфектыўнасць работы прадпрыемства. Але ўжо не толькі на рэнтабельнасць і прыбытак, а яшчэ і на выручку на аднаго сярэднясписачнага працуючага і дабаўленую вартасць на аднаго сярэднясписачнага работніка (таварная прадукцыя ў грашовым выражэнні за мінусам матэрыяльных затрат і паслуг старонніх арганізацый, падзеленая на колькасць працуючых). Да такога пераходу рыхтаваліся на працягу апошніх трох месяцаў. Па логіцы: зніжаем матэрыяльныя затраты, і чым яны меншыя, тым больш застаецца на работніка.

Такім чынам, перанакіроўваем намаганні калектыву не на аб'ём, не на вал. Аб'ёмы павінны быць таксама, але на першы план выходзіць эфектыўнасць работы.

Ведаць думку калектыву

Наш наступны субяседнік — намеснік генеральнага дырэктара па кадрах і ідэалагічнай рабоце Людміла ПРОП.

— У мінулы раз мы з вамі размаўлялі, Людміла Аляксееўна, аб сістэме інфармавання працоўнага калектыву. Сёння, калі вы не супраць, возьмем іншы аспект — вывучэнне грамадскай думкі.

— Адна з крыніц — ужо традыцыйныя сустрэчы нашых інфармацыйных груп з калектывамі вытворчых падраздзяленняў. Штомесяц у кожным цэху, у кожнай змене праводзіцца інфармацыйны дзень. У нас восем інфармацыйных груп, у склад якіх уваходзяць кіруючыя работнікі і вядучыя спецыялісты з вопытам прапагандысцкай работы. Гэта людзі, безумоўна, дасведчаныя, і не толькі ў пытаннях вытворчасці і эканоміцы. Яны выступаюць перад калектывамі згодна з графікам. Напрыклад, генеральны дырэктар са сваёй групай у гэтым месяцы выступае ў цэху № 7, я — у цэху № 10. Ёсць загад, які вывешваецца на інфармацыйных стэндах. Там указаны і склад груп.

Адказы на пытанні, якія людзі ўздымаюць падчас сустрэч, даюцца, па магчымасці, адразу, альбо яны фіксуюцца ў агульным пратаколе, і там пазначана, каму даручаецца вырашэнне. У апошні час даволі хваравітым было пытанне аб пенсійным заканадаўстве — у прыватнасці, аб памерах пенсіі для тых, хто працяглы час працаваў у шкодных умовах. Свае тлумачэнні аб змяненнях у законе аб прафесійным пенсійным страхаванні давялося даваць і кіраўніцтву акцыянернага таварыства, і кіраўніцтву прафсаюзнага камітэта — пабывалі ва ўсіх цэхах і зменах. У сваю чаргу, мы зрабілі шэраг захадаў, каб данесці думку калектыву да ведама канцэрна «Белнафтахім» і галіновага прафсаюза. Сустракаліся таксама з міністрам працы і сацыяльнай абароны РБ Марыянай Шчоткінай, звярнуліся да свайго дэпутата ў Нацыянальным сходзе — Наталлі Васільеўны Гуйвік.

Праблема важная для ўсіх прадпрыемстваў галіны, бо зараз павялічыўся адток кваліфікаваных кадраў. Чакаем прыняцця адпаведнага рашэння на дзяржаўным узроўні. Кіраўнікі цэхаў падаюць нам звесткі, колькі чалавек збіраюцца звольніцца, калі пытанне па памерах пенсіі не будзе вырашана станоўча. Напрыклад, у цэху № 6 усяго працуе 150 аператараў. Застаюцца працаваць 92. У ткацкім цэху збіраюцца звальняцца 56 чалавек. (Практычна ўсе, хто выпрацаваў «шкодны стаж».) Патрэбна будзе набіраць людзей і вучыць іх.

— Якія пытанні, акрамя гэтага, людзі ўздымаюць падчас сустрэч?

— Розныя. І аб зарплаце, аб жыллёвай праблеме. На будаўніцтва свайго жылля чарга вялікая, але зараз у сувязі з адсутнасцю льготнага крэдытавання тэмпы яго замарудзіліся. З месцамі ў інтэрнатах у нас асаблівай складанасці няма — толькі 12 сем'яў не маюць свайго вугла. Зараз выконваем рэканструкцыю мужчынскага інтэрната на вуліцы Камуністычнай і плануем навасселле да 55-годдзя прадпрыемства, якое будзем святкаваць увосень. Магчыма, што адзін паверх аддадзім сем'ям. Там зараз па-іншаму спланаваны жылыя пакоі, кухні (раней была адна кухня на паверсе) і месцы калектыўнага карыстання. Душавыя пакоі будуць не ў падвале, а таксама на паверхах.

— Вы расказвалі, што на прадпрыемстве пастаянна па ініцыятыве мясцовых улад праводзіцца анкетаванне...

— І мы непасрэдна ўдзельнічаем у зборы і сістэматызацыі гэтай інфармацыі, таму сітуацыяй валодаем таксама. Апытанне праходзіць па разнастайнай тэматыцы: па сацыяльнай сітуацыі ў горадзе, па аб'яднанні горада і раёна; у свой час праводзілі па выбарчай тэрната на вуліцы Камуністычнай і плануем навасселле да 55-годдзя прадпрыемства, якое будзем святкаваць увосень. Магчыма, што адзін паверх аддадзім сем'ям. Там зараз па-іншаму спланаваны жылыя пакоі, кухні (раней была адна кухня на паверсе) і месцы калектыўнага карыстання. Душавыя пакоі будуць не ў падвале, а таксама на паверхах.

— Вы расказвалі, што на прадпрыемстве пастаянна па ініцыятыве мясцовых улад праводзіцца анкетаванне...

— І мы непасрэдна ўдзельнічаем у зборы і сістэматызацыі гэтай інфармацыі, таму сітуацыяй валодаем таксама. Апытанне праходзіць па разнастайнай тэматыцы: па сацыяльнай сітуацыі ў горадзе, па аб'яднанні горада і раёна; у свой час праводзілі па выбарчай тэматыцы, і гэтак далей. Людзей просяць адказаць, наколькі яны ўпэўнены ў заўтрашнім дні, як бы яны ацанілі сацыяльна-палітычную сітуацыю ў сваім раёне горада, ці задавальняе культурнае і спартыўнае жыццё ў горадзе, як змянілася за апошні час сацыяльнае становішча чалавека, ці задавальняе работа мясцовай «вертыкалі». Людзі даволі актыўна выказваюцца па пытаннях, што іх хвалююць.

Танальнасць адказаў нармальная, у асноўным аптымістычная. Адказы ўважаныя, разумныя, аргументаваныя. Да іх варта прыслухоўвацца. Нават калі «расклад» такі: у заўтрашнім дні ўпэўнены восем, дзевяць — «хутчэй, не ўпэўнены». Для нас, як і для мясцовай «вертыкалі», гэта падстава больш канкрэтна працаваць у нізавых звеннях калектыву, лепш вывучаць жыццё людзей ва ўсіх яго праяўленнях. Сітуацыю ў горадзе на «спакойную» і «напружаную» дзеляць 50 на 50 рэспандэнтаў (у працэнтных суадносінах). Магчыма, мелася на ўвазе зліццё горада і раёна, але чыста адміністрацыйная працэдура павінна больш турбаваць не радавых гараджан, а чыноўнікаў, частка якіх будзе скарочана, а іншым давядзецца вырашаць цэлы шэраг арганізацыйных і фінансавых пытанняў.

Так што за адказамі патрэбна бачыць не проста статыстыку, а з'яву з усімі нюансамі. Людзі не адзначаюць нейкіх сур'ёзных карупцыйных праяўленняў наогул у Віцебскай вобласці. Што датычыць сітуацыі ў горадзе, то яны апасаюцца хуліганства і занепакоены адсутнасцю міліцыі на вуліцах.

Наогул мы цесна супрацоўнічаем з выканкамам. Ён нядаўна ўпершыню правёў даволі цікавае мерапрыемства — запрасіў на прадпрыемствы горада святароў. Нас наведаў Архіепіскап Полацкі Феадосій. З ім сустракаліся калектывы дзявятага і дванаццатага цэхаў.

Сустрэча прайшла цікава. Калі людзей вучаць Дабру, то гэта патрэбна толькі вітаць. Пра што гаварылі? Прабачце за банальнасць, але пра канец свету, які тады ўсё яшчэ быў на слыху. Архіепіскап звярнуў увагу прысутных на неспакойную сітуацыю ў цэлым шэрагу краін, на засілле чужых рэлігій у Еўропе. І заклікаў берагчы сваю краіну, сваю мараль і сваю веру ў чысціні. Добры прамоўца, ён сустрэў разуменне простых людзей. Выходзячы з гэтага, збіраемся запрасіць Архіепіскапа асвяціць наша прадпрыемства.

— У цэхах вісяць графікі прыёму. Яны дапамагаюць упарадкаваць гэтую працэдуру?

— Графікі прыёму вывешаны, але людзі ідуць і так, без усялякіх графікаў. Узнікла патрэба — заўсёды можна зайсці, параіцца, папрасіць дапамогі.

Да мяне асабліва часта заходзяць ткачыхі: некалі я працавала начальнікам ткацкага цэха. Скажам, нешта не зразумелі на сходзе — зойдуць удакладніць: «Мне незразумела». Увогуле, звяртаюцца па розных пытаннях: сітуацыя ў сям'і, нейкія матэрыяльныя ці нават юрыдычныя цяжкасці.

На лыжні аматары зімовых відаў спорту.

Сёння вы самі былі сведкамі адной такой размовы. Маладая работніца аднаго з цэхаў у суботу пайшла ў паліклініку па месцы жыхарства на прыём да ўрача, а потым не выйшла на работу. Субота ў нас — працоўны дзень. Апраўдальнага дакумента не прынесла, і такім чынам зарабіла прагул. У нашай размове з ёю ўдзельнічаў начальнік цэха, кансультавалі дактары здраўпункта.

Узважанае калектыўнае рашэнне давалася, як вы пераканаліся, не проста. З аднаго боку — прагул, за які можна звальняць. З другога — лёс зусім маладой дзяўчыны, няхай сабе крыху безадказнай. У горадзе не так многа работы, куды яна пойдзе? Адным словам, прымальнае рашэнне знайшлі. Спадзяюся, гэта будзе ўрокам на карысць.

І так амаль кожны дзень — узнікаюць нейкія пытанні, бо калектыў вялікі, у асноўным жаночы, а тут свая спецыфіка.

Рэгулярнымі сталі «Прамыя лініі» з удзелам генеральнага дырэктара і яго намеснікаў. Аб такіх сустрэчах з кіраўніцтвам загадзя папярэджвае папулярная ў калектыве шматтыражная газета «Трудовая смена», потым яна друкуе падрабязную справаздачу. Дарэчы, нашы журналісты ўвайшлі ў лік пераможцаў галіновага конкурсу шматтыражных газет за 2012 год.

— У вас надзіва вялікая ветэранская арганізацыя...

— Амаль дзве тысячы чалавек. Ветэраны звяртаюцца даволі часта, яны прыходзяць ці тэлефануюць, бывае, што і пішуць — перш за ўсё ў нашу ветэранскую арганізацыю. Работу яе савета ўзначальвае Вера Сямёнаўна Дзмітрыева, раней яна працавала намеснікам генеральнага дырэктара. Потым Вера Сямёнаўна прыносіць заявы ад тых, каму патрэбна дапамагчы, і ў першую чаргу — ветэранам вайны. Да Дня Перамогі абследуем іх жыллёвыя і бытавыя ўмовы, асабліва тых, хто пражывае ў прыватным сектары.

Належная ўвага ўдзяляецца ветэранам, якія жывуць адны. Канкрэтным праяўленнем такога клопату, напэўна, можна назваць усталяванне за кошт прадпрыемства пажарных апавяшчальнікаў.

Ветэраны ўдзельнічаюць ва ўсіх нашых святочных мерапрыемствах, праходзяць аздараўленне ў прафілакторыі, найбольш актыўныя наведваюць басейн за палову цаны — стараемся, каб яны не надта сумавалі.

За апошні час сабралася шмат станоўчых навін, падкрэсліла ў заключэнне Людміла Аляксееўна. Напрыклад, перавялі на кругласутачны рэжым работы кавярню «Задыяк», і зараз рабочыя вячэрніх і начных змен могуць атрымліваць тут гарачае харчаванне. А на базе акцыянернага таварыства праведзена выязное пасяджэнне гарвыканкама, на якім разглядалася арганізацыя грамадскага харчавання на прамысловых прадпрыемствах.

А вось адна з самых яркіх навін: начальнік цэха № 6 Алег Іванавіч Крывец, пра якога вы даволі падрабязна расказвалі ў мінулы раз, удастоены звання «Чалавек года Віцебшчыны». Мы ўсе гэтаму вельмі рады.

Вядома, што год на год не прыходзіцца. Па выніках работы за 2011-ы прадпрыемства заносілася на абласную Дошку гонару, мы атрымалі пераходны Чырвоны Сцяг за першае месца ў працоўным саперніцтве. Мінулы выдаўся крыху іншым. У сябе ў калектыве мы дамовіліся лічыць яго годам разбегу.



Снавальшчыца Святлана ШАХАНАВА.

Распалены матэрыял, які застыў нібы дзіўныя карункі, паступае ў лабараторыю аналізу шкла.

Вялікую работу праводзім па пастаўках у Кітай і на Тайвань — павялічваем іх аб'ёмы. Кітай зараз — заканадаўца моды (не Еўропа і не амерыканцы, як раней), менавіта там выпускаюцца асноўныя аб'ёмы шкловалакна (60 працэнтаў, больш чым на 100 заводах), ён наш асноўны канкурэнт на ўсіх рынках. І каб адправіць прадукцыю на яго рынкі і яна «пайшла», патрэбна кіравацца той самай тактыкай, якую агучыў генеральны дырэктар, — выбраць удалы час і канкрэтныя віды. Можна яшчэ дадаць — і правільныя аб'ёмы. У нас нават адзін час працаваў свой склад у Кітаі. Зараз пасылаем людзей на два месяцы ў Паднябесную, якія будуць працаваць там у рэгіёнах канкрэтна са спажыўцамі з мэтай павелічэння аб'ёмаў паставак.

Актыўна вывучаем Малайзію, В'етнам, Сінгапур, Інданезію. У В'етнам ужо была паездка, а там жыве 90 мільёнаў чалавек. (У Расіі — 120, і мы лічым яе асноўным партнёрам. А тут 90, таксама не «слаба».) Вядзём актыўную перапіску — гэта значыць, шукаем агульныя пазіцыі. У Сінгапуры запланавана выстаўка.

Ажыццяўляем адгрузкі не толькі ў Пакістан, пра што ўжо ўпаміналася, але і ў суседнюю Індыю. У Афрыцы вядзем пастаўкі ў ПАР, шукаем і іншых патэнцыйных пакупнікоў. Удзельнічалі ў выстаўцы ў Алжыры ў канцы мінулага года. Зараз сочым уважліва за Нігерыяй. Афрыканскі кантынент вялікі, і няма ніводнага вытворцы шкловалакна, таму прыглядаемся да яго.

Палітыка паводзін прадпрыемства на знешніх рынках сфармулявана да 2020 года, але гэта не ёсць нешта застыўшае, нязменнае. Мы будзем удасканальваць яе ў залежнасці ад рэалій, бо жыццё дыктуе свае рытмы. Як вам ужо вядома, мы ў многім залежым ад стану спраў у канкрэтных галінах эканомікі — прывадзіўся прыклад з сусветным аўтамабілебудаваннем, якое зараз у

і для вырабу ламінату, і для ізаляцыі розных вузлоў і дэталяў, правадоў, вытворчасці панэляў, крышак, бамперaў і г.д.

Новы віток камп'ютарызацыі прывёў да масавага карыстання айфонамі, мы да гэтага рыхтаваліся. Для мабільных тэлефонаў і планшэтнікаў патрэбна тканіна шчыльнасцю не 200, а 35 грамаў? Калі ласка. Пад тонкія тканіны куплены японскія станкі, якія зараз і паступаюць на прадпрыемства.

Распрацоўкай новых шклотканін пад патрэбы тых ці іншых вытворцаў займаюцца нашы навуковыя лабараторыі ў цеснай сувязі з упраўленнем маркетынгу. Акцыянернае таварыства працуе ў даволі высокім тэмпе, у тым ліку пры падрыхтоўцы і пастаноўцы новай прадукцыі на вытворчасць, і без такой уласнай навуковай базы не змаглі б абысціся. Убачылі на выстаўцы новы прадукт, пераканаліся, што ён будзе запатрабаваным — ставім на паток.

Мы буйнамаштабная вытворчасць, у год выпускаем 150 мільёнаў метраў тканін. Можна сказаць, што з'яўляемся самай буйной ткацкай фабрыкай у Еўропе. Вытворчасць серыйная, са сваім вытворчым цыклам. Тым не менш змены ў вытворчыя планы ўносім кожны месяц, як бы гэта ні было складана. І ў выніку прадукцыя — запатрабавана. Яе адгрузка вельмі часта вядзецца тут жа ў цэхах, па прынцыпе «толькі давай». Велікагрузныя фуры дастаўляюць марскія кантэйнеры ў Рыжскі порт, адтуль караблямі яны разыходзяцца па 5 кантынентах.

Аздараўленчы комплекс ахвотна наведваюць працаўнікі завода, члены іх сем'яў і жыхары горада. Тут ёсць басейн, залы для трэніровак і спаборніцтваў.

УНП 300059047 Публікацыю падрыхтавалі Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ, Віктар ПАЗНЯКОЎ і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Сёлета і акцыянернаму таварыству, і яго генеральнаму дырэктару Мікалаю Аляксандравічу Качаноўскаму спаўняецца па 55. Гады нараджэння ў іх шчаслівым чынам супалі. І прадпрыемства, і яго лідар, такім чынам, трапляюць у лік круглых выдатнікаў. Па новай шкале ацэнак таксама — калі скласці абедзве лічбы.

З віншаваннямі пачакаем да наступлення прыемных дат. Затое зараз самы час у пачатку новага гаспадарчага года пажадаць полацкім хімікам поспеху, які яны заслужылі сваёй больш чым паўвекавой стараннай працай.

Каб да прыгожай даты прыйшлі з новымі працоўнымі набыткамі і... новымі планамі. Бо такое жыццё.

Удакладнім: такое жыццё ва ўмовах рынку.

Ігуменскі тракт

№ 4 (19)

Мінуліся тыя ча́сы, калі ляталі каўбасы

Кулінарная Энцыклапедыя Мікалая Нікіфароўскага

Дыдона варыва ўлівала,
Шматкамі мяса ў місы клала
І забяляла малаком.
Трупаціла яна крупеню,
Яечню, руднік, жур, смажэню,
Каму пячэню з часнаком.

«Энеіда навыварат».

Вось мы дайшлі да трэцяга раздзела кулінарнай энцыклапедыі Мікалая Нікіфароўскага, які называецца «скарамяціна, пячысты». Сёння мы працягнем «каўбасную» тэму.

Нікіфароўскі з добрым разуменнем справы піша пра тое, што ў любой сялянскай гаспадарцы ніводная частка тушы жывёлы не прападала дарэмна. Так, кроў ішла на «крывянікі» — бліны, аладкі, каўбасы — або на поліўку. Грудныя вантробы пад агульнай назвай «печанёў» — у «стравы» ці на смажаніну; трыбухі — зноў жа ў «стравы» або ў «надзіванікі» (начыненыя кішкі, каўбасы); галава і ногі — на халоднае. Нават ядры самцоў не выкідваліся: мужчыны падсмажвалі іх уласнаручна і з'ядалі да вылізвання патэльні.

ДАРУНКІ СВЕЖАНІНЫ

Сам перадкалядны працэс забівання хатняга парсюка ў перыяд зімовага сонцастаяння захаваў у сабе адметныя рысы язычніцкага ахвярапрынашэння і назаўсёды ўрэзаўся ў памяць таго, хто хоць аднойчы яго бачыў. Бялюткі снег з барвянымі разводамі крыві, золата саломы і блакітны агонь паяльных лампаў, кавалкамі свежыны і колцамі каўбас адорваліся родныя і суседзі, падобныя ж дарункі атрымліваліся ў адказ — і ўсё гэта стварала непаўторную атмасферу надыходзячага Свята.

КАБ НЕ АБРАСЦІ ТЛУШЧАМ

Ужо адзін пералік скаромных страў сведчыць пра іх разнастайнасць, а яшчэ былі і малочныя, якія ўлетку часта замянялі мясныя. Чаму? Ды таму, што холад і мароз патрабавалі больш каларыйнай ежы, а ўлетку чалавек добра сябе адчуваў і на малочна-раслінных стравах. Да таго ж чатыры гадавыя пасты і цяжкая праца не дазвалялі беларускім сялянам абрастаць тлушчам.

На мяжы посных і скаромных страў знаходзіліся яечні: смажаныя або тушаныя і пражаныя. Пражанай называлася звычайная яечня, падсмажаная на патэльні. А вось смажаная патрабавала больших намаганняў для прыгатавання. Трэба было ўзяць бутэльку малака, разбіць туды 5 яек, дадаць солі і перамяшаць (нагадаю шаноўным чытачам, што бутэлька — руская мера вадкасці, роўная 0,6 літра. — **А. В.**). Потым сумесь залівалася ў міску, гаршчок або глыбокую патэльню і ставілася ў печ на «вольны дух», дзе запякалася да сярэдняй густаты, але не да наздраватасці. Смажаная яечня лічылася святочнай заедкавай стравай як для багацеяў, так і для беднякоў. Ужывалася і цёплай, і халоднай.

Нікіфароўскі піша, што пад агульнай назвай «пячыст» трэба разумець вялікія кавалкі засмажанага мяса альбо цэлую жывёлу: гусь, качку, курыцу, парася і інш. «Пячысты» бываюць:

а) тушаныя, калі мяса тушыцца ў закрытым посудзе;

б) смажаныя, калі мяса падсмажваецца на адкрытай патэльні або на металічнай блясе;

в) адвараныя, калі мяса вымаецца са «стравы» і некаторы час стаіць у гарачай печы.

Самай лепшай з «пячыст» лічылася «тушонка», таму што разам з мясам і салам у закрытым посудзе тушылася бульба, якая насычалася тлушчам і прымала апетытны залаціста-карычневы колер. «Тушонка» шчодра прыпраўлялася цыбуляй і перцам, чаго і напалову не было ў «смажанцы».

«Печані» (грудныя вантробы, да якіх залічваліся і ныркі) гатаваліся таксама, як і «пячысты», і выкарыстоўваліся ў многіх стравах. «Печанёвае пячыста» ўжывалася і ў халодным выглядзе, што рэдка здаралася з сапраўдным «пячыстам».

КОЖНЫ ЛАСЫ НА КАЎБАСЫ

Адметнай святочнай стравай заўсёды лічыліся «каўбасы», якія падзяляліся на «мясовыя», «печанёвыя» і «крываўнікі». Каўбасы былі вядомы беларусам са старажытных часоў і ў традыцыйнай побытавай культуры сімвалізавалі ежу «ад пуза», былі своеасаблівым атрыбутам «залатога веку», багацця, дастатку і шчодрай узнагароды. Асабліва цесна гэтая страва была звязана з Калядамі і нярэдка мела выразную эратычную сімволіку: «Пайшла Каляда ў шостую хату, //А ў шостай хаце каўбасу пякуць ды і нам дадуць // Хоць па маленечкаму кусочку, // Каб любілі хлопцы вашу дочку». А яшчэ ў колцы каўбасы мог прысутнічаць і магічны элемент замкнёнага кола страўнага мікракосму.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Нікіфароўскі піша: «Часцей за ўсё каўбасы вырабляліся ў канцы каляднага посту пры забоі адкормленых парсюкоў, мяса і сала якіх, галоўным чынам, ідзе на каўбасы. Каўбасны матэрыял наразаецца кавалачкамі, шчодра запраўляецца цыбуляй, перцам і напіхваецца пры дапамозе бутэлечнага рыла ў свіныя або авечыя кішкі, прызнацца, не зусім якасна пачышчаныя. За выключэннем апошняй акалічнасці і занадта доўгага іншы раз захоўвання, мясцовыя каўбасы не абразяць нічыйго смаку.

Пры неабходнасці каўбасы падсмажваюцца на патэльні або «затушваюцца» ў «пражаніне»: і ў тым, і ў другім выпадку яны наколваюцца іголкай для таго, каб не лопаліся і не развальваліся. У халодным выглядзе каўбасы ўжываюцца толькі ў дарозе». Этнограф згадвае пра цікавыя варыянты захоўвання каўбас у мясным расоле або ў збожжы, дзе яны маглі ляжаць аж да «тоўстай суботы».

Аляксандр ВАШЧАНКА.

Ці можам мы ў наш час, паважаныя чытачы, прыгатаваць «пальцам пханую» каўбасу? Калі вы вясковы жыхар і трымаеце ўласнага парсюка, тады, вядома, праблем няма. А што рабіць гараджанам? Прапаную адзін з варыянтаў хатняй каўбасы, які можна прыгатаваць і на гарадской кухні. Нам спатрэбіцца: 1,5 кг свініны (пажадана з рэбраў ці хрыбта); 1,5 кг ялавічыны; 100 г гарэлкі; прыправа з молатага кмену, каляндры, насення кропу, чорнага перцу гарошкам, лаўровага ліста; соль, часнок, натуральная абалонка, якую можна набыць на рынку. Мяса павінна быць ахаладжанае, а не замарожанае. І яшчэ варта памятаць пра тое, што пры адкорме свіней на свінакомплексах выкарыстоўваецца рыбны камбікорм, таму сапраўдны смак будзе ў каўбасы з мяса жывёл, адкормленых у хатніх умовах.

Мяса наразаем нажом на не надта дробныя кавалкі, дадаем соль, прыправу, дробна парэзаны часнок, гарэлку, перамешваем і пакідаем на ноч у халодным месцы. Раніцай набіваем абалонку мясам. Лепш выкарыстоўваць мясарубку без рашоткі і нажа, са спецыяльнай насадкай, на якую нацягваем абалонку, канец якой перавязваем тоўстай ніткай або шпагатам. Пры напаўненні абалонкі пратыкаем яе ў некалькіх месцах іголкай. Другі канец абалонкі таксама перавязваем. Закручваем каўбасы колцамі і падвешваем пад столлю на кухні. Праз 3 дні яны будуць гатовы! Пішыце пра свае варыянты прыгатавання каўбас, шаноўныя чытачы.

■ Асоба

Срэбная страла праз чырвонае поле праляціць і сёння

Уладзімір Крукоўскі — асоба знакавая ў многіх сэнсах. Ён вядомы даследчык беларускай геральдыкі, сабраў значную калекцыю шляхецкіх гербаў з выявамі і апісаннямі. Акрамя таго, Крукоўскі — пачынальнік беларускамоўнага плаката, сам выдатна тварыў у гэтым жанры, ды і многіх мастакоў сабраў разам і прыахвоціў займацца плакатам, беларускім па мове і па змесце.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выдавецкі дом «Звязда» неўзабаве выпусціць дапоўненае перавыданне кнігі Крукоўскага «Срэбная страла ў чырвоным полі», у якую ўвойдзе яшчэ 54 гербы, што ўдалося адшукаць даследчыку. Напачатку мы надрукуем іх на старонках нашай газеты. А зараз сустрэліся з аўтарам і мастаком, каб распытаць пра яго даследаванні, творчы лёс ды і саму геральдыку. Расказвае Уладзімір Крукоўскі:

— Усё пачалося ў савецкія часы ў 1991 годзе, яшчэ да распаду СССР. «Звязда» надрукавала мой асабісты радавод: я займаўся ім, пакуль дакументальна не пацвердзіў усё тое, што ведалі мае родзічы. Гэта цікавы момант, бо савецкая газета надрукавала шляхецкі радавод — гэта была своеасаблівая сенсацыя, прынамсі для майго акружэння, для маіх сяброў, калег, аднадумцаў.

— Як атрымалася, што вы, працуючы над уласным радаводам, сталі займацца яшчэ і іншымі беларускімі родамі, шляхецкімі, і іх геральдыкай?

— У той час я быў мастацкім рэдактарам часопіса «Спадчына» і дзякуючы гэтаму мог свабодна бываць у архіве. Працуючы заадно над уласным радаводам, я наткнуўся на вельмі багаты недаследаваны пласт неабнародаваных шляхецкіх родавых гербаў з цікавымі малюнкамі. Мяне, як мастака, у першую чаргу зацікавіў візуальны бок. І я паціху збіраў, фатаграфаваў — атрымалася даволі шмат. У выніку я склаў усё гэта ў кнігу, у якую ўвайшлі паўтары сотні самых папулярных у беларускай шляхты гербаў і адпаведныя тэкстоўкі да іх. Кніга «Срэбная страла ў чырвоным полі» разышлася вельмі хутка. Некаторыя экзэмпляры давалося пасылаць нават у Маскву, Піцер, Геленджык.

Я ўвесь час сядзеў на гэтай тэме, працягваў шукаць, збіраць. За пару апошніх гадоў, дарэчы, адкрыліся некаторыя цікавыя матэрыялы. У фондах Нацыянальнага гістарычнага музея, па падказцы знаёмых, я знайшоў 250 радаводаў шляхты былой Віцебскай губерні. Трапілі да мяне і спісы 1908 года магілёўскай шляхты: на рускай мове — «дворянство» — некалькі тысяч прозвішчаў. Здабыў я і пэўны матэрыял па шляхце самой Вільні і Віленскай губерні. Дзякуючы гэтым звесткам мой набытак узбагаціўся яшчэ на 54 нованадкрытыя гербы. Раней яны нідзе не публікаваліся, прынамсі арыгіналы выяў, якія знаходзяцца ў тэкстах ці на асобных лістах. Так, ва ўжо згаданых віцебскіх шляхецкіх матэрыялах цэлы стос — 250 аркушаў рознага памеру, некаторыя велічынёй на палову стала, размаляваныя, з подпісамі — аўтэнтык 2-й паловы XVIII — пачатку XIX стагоддзя. Некаторыя з іх былі зроблены яшчэ да падзелу Рэчы Паспалітай.

— Скажыце, чым адрозніваецца прыватная геральдыка ад гарадской? Як так склалася, што не толькі гарады, але і роды маюць свае гербы?

— Калісьці асобы і гарады маглі мець адны і тыя ж гербы: калі мястэчка належала нейкаму магнату, то яго гербам і карысталася. А ў больш познія часы геральдыка гарадская падпарадкоўвалася Магдэбурскаму праву, калі разам з прывілеямі, з унутрыгарадскімі статутамі, законамі, правіламі паводзін, распарадкам жыцця гораду вярхоўнай уладай — князем, каралём — прысвойваўся герб. Часам ён перагукаўся з ранейшым уладальнікам, часам, што называецца, прыдумляўся па пэўных параметрах — для гэтага існавала геральдычная служба і ў ёй герольды, якія і радаводы складалі, і прыдумлялі гербы, і малявалі іх. Хутчэй за ўсё, прыватная геральдыка ўзнікла раней — як адрозненне асобы чалавека. Беларуская радавая геральдыка мае вялікія адрозненні ад нямецкай ці французскай. Адрозненне нашых гербаў ад заходніх у тым, што там яны назначалі пэўную асобу, у нас — цэлыя групы людзей, якія маглі належаць нават да розных родаў. Таму колькасць гербаў як малюнкаў у нас значна меншая, чым у старога рыцарства. Хоць і ў нас былі гербы, якімі карыстаўся толькі адзін род або нават чалавек, без права наследавання.

— Чаму ж так адбывалася, што ў Заходняй Еўропе адна асоба — адзін герб, а ў нас да аднаго герба магло належаць трыста родаў? Гэта можна неяк патлумачыць?

— Гэта тэма асобнага даследавання, я ім не займаўся. Мая задача была зусім іншай. Мяне заўсёды абураў прынцып нашых ранейшых гісторыкаў, прапагандыстаў, ідэолагаў, што ў Беларусі не было свайго шляхецкага саслоўя. Маўляў, беларусы — гэта сяляне, а ўся знаць, магнатэрыя — гэта або палякі, або рускія. Таму я ставіў перад сабой задачу паказаць, што ўсё гэта было, проста старанна схаванае, прытаптанае, затушаванае — каб ніхто і не думаў, і не здагадваўся пра гэта. Насамрэч у нас была вельмі багатая на колькасным стане шляхта. Калі ўзяць пачатак XIX стагоддзя — той час, калі Беларусь увайшла ў склад Расійскай імперыі, — расійскія ўлады былі шакіраваны, што ў нас фактычна на тэрыторыі ВКЛ у некаторых паветах колькасць шляхты даходзіла да 10%, у той час як у Расіі дваранства — 1-2%. Таму і пачалося такое бязлітаснае вынішчэнне гэтага стану, усімі справядлівымі і несправядлівымі спосабамі. Таму і хацелася давесці беларусам, што ў нас было вельмі багатае шляхецтва, вельмі развітае колькасна і якасна, цікавае з гістарычнага пункту гледжання. Усё гэта можна паказаць праз геральдыку, праз старажытныя дакументы, якія, на шчасце, захаваліся і існуюць і сёння. Працуючы ў архіве ў 319-м фондзе, у якім захоўваюцца генеалагічныя дакументы, матэрыялы па Мінскай губерні (нават маскоўскія даследчыкі геральдыкі здзіўляліся і захапляліся) я пераканаўся, што яны захаваліся амаль цалкам.

Калі людзі да мяне звяртаюцца, каб зрабіць свой радавод, я ім кажу, што першае, што трэба ведаць, — гэта свайго продка па мужчынскай лініі, дарэвалюцыйнага, другое — гэта месца жыхарства і трэцяе — ісці і працаваць у архіве.

— Якія малюнкі былі адзнакамі, што гэта гербы менавіта з тэрыторыі ВКЛ, на думку замежных даследчыкаў?

— Абсалютна нельга размяжоўваць, бо набор элементаў быў збольшага аднолькавы ўсюды: зброя, архітэктурныя дэталі, астранамічныя знакі, розныя формы крыжоў, часткі жывёлы, у класічнай геральдыцы браліся і аднолькавыя колеры.

— Вы пісалі ў сваёй кнізе, што найбольш часта ў беларускіх гербах выкарыстоўваліся страла, меч, крыж, чырвоны колер. Ці магчыма гэта неяк патлумачыць?

— Гэту сімволіку я асабіста тлумачу толькі адным — нашай гістарычнай сітуацыяй: пастаяннымі войнамі, а калі дакладна, пастаяннай абарончай сітуацыяй. Таму і выкарыстоўваецца чырвоны колер — ён вельмі шматзначны: з аднаго боку дае адчуванне жыцця, з другога — пакутаў, нават смерці. А ўсе элементы вайсковага рыштунку — таксама прыкмета шляхты, вайсковага саслоўя.

— А ці звяртаюцца да вас звычайныя людзі, каб вы дапамаглі ім стварыць свой радавод?

— Так, людзі просяць дапамагчы ім, аднак я магу толькі накіраваць, падказаць, з чаго трэба пачынаць. Звычайна шукаць пачынаюць тыя, хто ўжо сустрэў сваё прозвішча ў публікацыях, хто асацыюе сваё прозвішча менавіта са шляхтай. Хаця можна і купецкі, рамесніцкі, мяшчанскі радавод стварыць па дакументах, калі яны захаваліся. Вядомы беларускі даследчык геральдыкі Анатоль Цітоў знайшоў свае карані аж у пачатку XVIII стагоддзя, дзякуючы вопыту і ўменню шукаць, працы ў архівах. Калі людзі да мяне звяртаюцца, я ім кажу, што першае, што трэба ведаць, гэта свайго продка па мужчынскай лініі дарэвалюцыйнага (бо ў 1918 пасля рэвалюцыі ўсе саслоўі былі адменены, дакументы перасталі весціся), другое — гэта месца жыхарства (шляхта з аднолькавым прозвішчам магла жыць у розных паветах, мела магчымасць свабодна перасяляцца) і трэцяе — толькі архіў, ісці і працаваць туды (цяпер трэба выдаткоўваць грошы на гэта).

— Вас лічаць і пачынальнікам беларускага па змесце плаката...

— Так, калі я пачаў прафесійна займацца гэтым, плаката, беларускага па змесце, па мове, амаль не існавала. Выдаваліся зрэдку агітацыйныя, святочныя, але гэта была кропля ў моры рускамоўнай прадукцыі. Таму была вельмі сур'ёзная задача — павярнуць сітуацыю так, каб беларускі плакат стаў беларускім па мове, па тэматыцы. Калі хтосьці малюе, скажам, Цянь-Шань, а пры гэтым жыве і працуе ў Мінску, яго ўсё роўна вельмі складана залучыць у кола беларускага жывапісу, бо тэма таксама акрэслівае нацыянальную прыналежнасць. Тым больш у плакаце, дзе два самыя важныя фактары — мова і тэма. Далей ідуць дапаўняльныя рысы — і каларыстыка, і традыцыі. Як ні дзіўна, у беларускага плаката ёсць даволі доўгія традыцыі. У выяўленчым кірунку ёсць чаму павучыцца ў мастакоў пачатку XX стагоддзя, якія працавалі на Беларусі і рабілі плакаты. Я ж у свой час шмат мастакоў прыцягнуў да працы ў жанры плаката: сагітаваў, пераканаў — стварыў кола беларускіх плакатыстаў.

— Вы аўтар плакатаў на гістарычную тэматыку: «Помнікі архітэктуры — нацыянальны скарб», «Адновім помнікі дойлідства», што адносяцца да 1970-1980-х гадоў. А як зараз, праз тры-чатыры дзесяцігоддзі змянілася стаўленне да архітэктурнай спадчыны?

— Калі казаць пра агульнае стаўленне народу — усіх слаёў, пачынаючы з вясковай даяркі і сканчаючы функцыянерам Міністэрства культуры, то стаўленне практычна не змянілася. Аднак штосьці робіцца, пішуцца планы. Пры непасрэдным удзеле былога міністра культуры Паўла Латушкі распрацавана дзяржаўная праграма «Замкі Беларусі». Гэта вельмі вялікі крок. Раней пра такое ніхто нават не думаў. Хаця спроба аднавіць Мірскі замак была і ў савецкія часы. Выдаткоўваліся мізэрныя грошы — для таго, каб хаця б дах накрыць — але далей гэтага справа не ішла. А цяпер, калі ласка, Нясвіжскі палац працуе ва ўсёй сваёй красе, Мірскі працуе, узяліся за палац Сапегаў у Ружанах. Натуральна, жыццё не стаіць на месцы, прагрэс ёсць ва ўсім, аднак заўсёды хочацца, каб былі іншыя маштабы, тэмпы і капіталаўкладанні ў гэтую справу. А побач з рэстаўрацыяй адных аб'ектаў спакойна руйнуюцца ацалелыя з XVII ці XIX стагоддзя помнікі архітэктуры — дастаткова ўспомніць Гародню. Ды і ў Мінску — з аднаго боку ўзнаўляецца нейкі сабор, а з другога зносіцца малапрыкметны домік, які дзесяцігоддзямі разглядаўся як помнік архітэктуры акрэсленага перыяду. Тут поўны разброд, аднак зрухі ёсць, калі ўлічыць той час, за якім мне даводзілася назіраць. Таму тэма захавання архітэктуры яшчэ не закрыта.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

■ Геральдычная калекцыя

ГОНАР РАДАВОДУ

Абданк

У чырвоным полі два «Абданкі» адзін над адным, паміж імі — залатая карона.

Адзінец, Адынец, Бараноўскі, Богуш, Бурба, Віславух, Гурын, Дабравольскі, Драбовіч, Расалоўскі, Рыкала, Шастоўскі, Шышка.

Акунь

У срэбным полі блакітная куля з залатымі апаскамі, на ёй залатая страла, двойчы перакрыжаваная.

Акінчыц, Аксак, Асановіч, Бернатоўскі, Бутовіч, Вайцяховіч, Вуловіч, Галькоўскі, Грабоўскі, Гружэвіч, Грыневіч, Даўнаровіч, Дулеўскі, Жабінскі, Карабановіч, Кудзіновіч, Ліпінскі, Лук'яновіч, Лук'янскі, Лядніцкі, Мацкевіч, Міраслаўскі, Мурашка, Мусніцкі, Паўловіч, Прышыхоўскі, Раманоўскі, Скірмунт, Суднік, Талькоўскі, Тамковіч, Шэмбель, Юроўскі, Яновіч.

Анцута

У чырвоным полі срэбная страла вастрыём угору, злева ад яе срэбная васьмікутная зорка, справа — срэбны маладзік з рогамі да стралы.

Анцута, Анчыц, Гаўрылкевіч, Есіповіч, Звяровіч, Спірыдовіч.

Асэнка

У чырвоным полі срэбны басак наўкос, тронкам уніз.

Навіцкі, Сіла-Навіцкі, Шалкоўскі, Шаткоўскі.

■ Постаці

ДУША МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Ён пісаў пра дзве душы. Адна з іх — жыла, перажывала, пакутавала, асэнсоўвала і паказвала, што ёсць. Другая — адкрылася праз яго творы, якія даходзілі да чытача гэтак жа пакутліва, як ішло яго жыццё, але ў мастацкім выяўленні, дзе ў літаратурнай душы растворана душа цэлага народа, які праходзіў свой шлях выспявання, а можа, праходзіць і зараз. Да 120-годдзя пісьменніка Максіма Гарэцкага сёлета былі прымеркаваны «Гарэцкія чытанні», дзе грамадскія дзеячы, навукоўцы і літаратары разважалі пра тое, чым актуальны Гарэцкі сёння. Актуальны, таму што ў адной асобе спалучыліся пісьменнік, навукоўца і, можна казаць, нацыянальны прарок: яго творы паказваюць душу беларусаў, якая праз усё мінулае стагоддзе (а можа, і зараз) вызначаецца з вартасцямі і якасцямі, праз якія можна атрымаць ураванне і блаславенне.

Васіль ЗУЁНАК, паэт:

— Я хачу нагадаць пра «Роднае карэнне», адно з першых апавяданняў Максіма Гарэцкага. На самым пачатку свайго творчага шляху пісьменнік робіць заяву, абвяшчае сваё творчае крэда: «Усё ад родных каранёў. Гэта сонца ў кроплі расы, тут і будучы Максім Гарэцкі, тут і прадчуванне і пазнакі будучых пошукаў нашай літаратуры. Тут і плынь жыцця, тут і ветразі, пад якімі выпраўляюцца ў невядомы свет дзеці вёскі — да навукі, да святла, да спасціжэння ісцін жыцця, з памкненнем да разгадкі штодзённых клопатаў і вечных таямніц. Ад гэтых каранёў і «Дзве душы» не толькі ў сэнсе раздвоенасці аднае чалавечае душы перад загадкавымі заломамі быцця, але і ў сэнсе еднасці, зліцця дзвюх душ, дзвюх іпастасяў пісьменніка і яго літаратурнага двайніка, героя мастацкага твора. Адгэтуль вытокі іх — пісьменніка і яго герояў — філасофскіх разваг аб сэнсах зямнога і паслязямнога... Максім Гарэцкі адзін з самых (калі не самы) філасафічных нашых пісьменнікаў, і тут палягае адна з першых падказак, а хутчэй, жаданне пабачыць кнігу з аналітычным грунтоўным даследаваннем яго філасофска-гістарычных пошукаў у звязцы з мастацкімі пошукамі пісьменніка, мысляра Максіма Гарэцкага. І ці не наспеў час стварыць, падрыхтаваць і выдаць слоўнік мовы Максіма Гарэцкага? Трэцяя падказка кожнаму, хто ўзяўся за літаратурнае пяро: творчасць Максіма Гарэцкага — выдатная школа майстэрства, і шчаслівы той, хто далучаецца да гэтай школы.

Анатоль БУТЭВІЧ, пісьменнік:

— У гэтыя дні ў Нацыянальнай бібліятэцы праходзіць выстаўка, прысвечаная 120-годдзю Максіма Гарэцкага. Я асмеліўся адну кніжачку пагартаць: усе тэксты густа падкрэслены алоўкамі. Значыць, у гэтых кніг быў чытач. Як мне ўяўляецца, чытач неадназначны. Таму што крэслілі і тады, калі выйшлі кніжкі, захапляючыся слоўцамі, думкай, мастацкасцю; але крэслілі і тыя, хто пазней выкрэсліваў Гарэцкага з гісторыі літаратуры. Мне падалося, што гэтая выстаўка дапамагае зразумець, як трэба чытаць нашых літаратараў, але чытаць і тых, хто некалі іх чытаў. Таму што літаратурная творчасць таго ж Гарэцкага некалі перажыла не адно чытанне, чытанне з прыхільнасцю, чытанне з непрыхільнасцю. Чытанне з мэтай даць моладзі разуменне мастацкасці, прыгажосці, патрэбнасці, глыбіні думкі, і чытанне зусім адваротнае: даказаць, што гэта нявартае, нязначнае, непатрэбнае. Але гэта таксама навука, гэта таксама дае магчымасць бачыць гісторыю рэальна. Такая рэальнасць дае магчымасць бачання таго, што і як адбывалася. Наталіць пачуццё, што мы ўсе, нацыя, складаемся з родаў — з гісторыі родаў, з гісторыі кожнага чалавека. Я б хацеў нагадаць пра значэнне наогул роду Гарэцкіх для беларускай культуры і навукі. Беларусы вельмі памяркоўныя. Мы свае роды не вельмі шанавалі. Можа, ведаем тых, хто быў найбольш на слыху. Але ж з кожнага роду складаецца гісторыя нацыі. Таму варта разглядаць дзейнасць як Максіма, так і Гаўрылы Гарэцкіх, якога лёс таксама не пашкадаваў. Памятаю была выстаўка, дзе было каля 30 папяросных, тоненькіх маленькіх староначак, напісаных уборыстым почыркам Гаўрылы Гарэцкага да сваёй жонкі — гэта такая споведзь, такое прачулае, праніклівае слова кахання, і гэта было напісана ў прадчуванні кепскага лёсу. Дай Бог, каб мы гэта маглі прачытаць і ўсвядоміць. Гэта і ёсць тое родавае адрозненне Гарэцкіх, што не замінала ім быць людзьмі пры любой сітуацыі. Нам бы трошкі гэтага памкнення, жадання адкрыць для сябе Гарэцкага Максіма, Гаўрылу, нашчадка гэтага роду Радзіма. Род Гарэцкіх — гэта род беларускай нацыянальнай годнасці і школы, як трэба трымацца ў сённяшнім дні, захоўваць і ўмець адстойваць сваё.

Радзім Гаўрылавіч ГАРЭЦКІ:

— Так сталася, што пры жыцці ў Максіма Гарэцкага не было ніводнага годнага юбілею. У 20 гадоў ён пачаў літаратурную дзейнасць, але быў яшчэ малады. У 25 жыў разам з Янкам Купалам у Смаленску і там сустрэў рэвалюцыю. Быў сведкам страшэнных людскіх пакут у цяжкі і люты 1918 год (па словах Купалы), у які ён быў амаль непрытомны. Тады ён пачаў пісаць аповесць «Дзве душы». У 30 гадоў Гарэцкі — ужо вядомы пісьменнік, але нядаўна вызвалены з турмы «Лукішкі» — у канцы 1923 года пераязджае з Вільні ў Мінск. Тады было таксама не да юбілею. Ужо праз 7 гадоў хаця і прызнаны адным з заснавальнікаў беларускай мастацкай прозы, але па справе «Саюз вызвалення Беларусі» трапіў у «Архіпелаг ГУЛАГ». У Вятцы сям'я Максіма Гарэцкага адзначыла яго 40-годдзе святочнай вячэрай. Як пісалі сведкі, была тушаная капуста з алеем і самавар гарбаты. Яшчэ праз 7 гадоў 10 лютага 1938 года Гарэцкі быў расстраляны, не дажыўшы да 45 гадоў 8 дзён. Творы пісьменніка былі забаронены, большасць знішчана. Я хачу нагадаць, што сёлета не толькі радасны юбілейны год з дня нараджэння, але і 75 гадоў з яго расстрэлу... Да імя і спадчыны Максіма Гарэцкага пачалі звяртацца толькі амаль праз 30 гадоў пасля яго смерці. Але сёння ёсць звесткі пра тое, што выдатныя філосафы замежжа, сучаснікі Гарэцкага, не толькі добра ведалі, але і высока цанілі яго творы: гэта вынікае з лістоў Кафкі, які адзначаў раман «На імперыялістычнай вайне», Гашака, які пісаў, што раман «Дзве душы» больш варты, чым «Уліс» Джойса. Камю ў лісце да Сартра выказваў абурэнне ад арышту Гарэцкага... Максіму Гарэцкаму і сёння не шчасціць на памяць: не ўдалося захаваць у Беларусі адзіны дом, дзе жыў пісьменнік. Яшчэ 20 гадоў таму было прапанавана ў гэтым доме зрабіць музей Максіма Гарэцкага. У тым доме быў некалькі раз Якуб Колас, іншыя нашы выдатныя дзеячы культуры. Але ад дома не засталося ні духу, ні знаку...

Ганна ЗАПАРТЫКА, дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва:

— Сёння варта больш пільна паглядзець на віленскія дакументы 1920-х гадоў. Справа ў тым, што многія з гэтых дакументаў напісаны алоўкам, таму графіка адпаведная. У пачатку 1920-х Максім Гарэцкі з сям'ёй жыў у Вільні, з невялікім перапынкам. Гэты час ёсць перыяд жыцця Максіма Іванавіча, які, па сутнасці, быў абдзелены ўвагай. Пры складанні летапісу жыцця і творчасці ўсе гэтыя моманты трэба ўлічыць, таму што яны пацвярджаюцца пэўнымі дакументамі, вельмі дакладнымі. Дакументы, якія мне ўдалося выявіць, трэба разглядаць у двух ракурсах: аўтографы Максіма Гарэцкага, на якія дагэтуль не была звернутая ўвага. І пэўныя факты яго біяграфіі менавіта віленскага перыяду. Першы дакумент — пратаколы, а дакладней, матэрыялы ўстаноўчага сходу сяброў беларускага навуковага таварыства, які адбыўся 10 чэрвеня 1920 года на Вастрабрамскай, 9. Пратакол напісаны рукой Максіма Гарэцкага. Стыль, словы, лексіка, характар пісьма — усё вельмі характэрна для Максіма Іванавіча. У будучым гэты дакумент павінен увайсці ў пэўны збор яго твораў. Сход устанавіў колькасць членаў урада Беларускага навуковага таварыства, прэзідыума, пасля было галасаванне. Само галасаванне таксама фіксаваў Максім Іванавіч. Гарэцкі ўрэшце быў выбраны скарбнікам. Дакументы беларускага навуковага таварыства варта паглядзець больш дакладна, таму што там могуць быць не толькі аўтографы, але можа быць магчыма ўдакладненне нейкіх дэталяў яго жыцця віленскага перыяду. Як, напрыклад, цікавыя дакументы адносна працы і яго адносін з газетай «Незалежная думка». Захаваўся блок дакументаў гэтай газеты, ганарарныя ведамасці, дзе Максім Іванавіч паставіў свае подпісы. Напрыклад, ён атрымаў ганарары за артыкулы ў нумарах 1 і 2 (усяго 457 радкоў, за якія зарабіў 274 маркі 20 пфенінгаў). Каштоўнасць распіскі ў тым, што ён называе 2 невядомыя нам юбілеі — Купалы і Багушэвіча, да якіх былі напісаны артыкулы...

Максім Гарэцкі — асоба, якая, магчыма, нам яшчэ не адкрылася цалкам. І не толькі таму, што для даследчыкаў спраў яшчэ хопіць. Але і таму, што чытанне яго твораў у Беларусі застаецца актуальным і ў XXI стагоддзі.

Ларыса ЦІМОШЫК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 28 февраля 2013 г. 133-го ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской центр недвижимости

по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений, помещений, машино-мест, их частей (за исключением жилых помещений), находящихся в коммунальной собственности г. Минска

№ предмета торгов	Наименование объекта имущества, его адрес, описание, условия аукциона	Общ. пл. (кв.м)	Начальная цена предмета торгов, руб.
УП «ЖРЭО Заводского района г. Минска», тел.: 395 80 46, 291 55 11			
1	Ул. Бачило, 4, помещение на 1 этаже, общий вход с жильцами, имеется естественное освещение, отопление. Необходимо обустройство отдельного входа. Под административные цели (офис)	14,3	1 430 000
2	Ул. Красина, 27, помещение на 2 этаже, имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение, общий вход с другими арендаторами, санузел совместного пользования. Под административные цели (офис), мастерскую	30,3	3 030 000
3	Ул. Нестерова, 51, помещения на втором этаже, санузел, отопление, водоснабжение, естественное освещение. Под объект общественного питания (кафе). Реконструкция, перепрофилирование за счет средств арендатора	238,8	23 880 000
4	Пр. Партизанский, 147, помещение цокольного этажа, имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение. Требуется ремонт. Под торговый объект непродовольственной группы товаров (сантехника, стройматериалы), бытовое обслуживание (ремонт сложной бытовой техники, телерадиоаппаратуры, фотоуслуги)	140,9	14 090 000
УП «ЖРЭО Ленинского района г. Минска», тел. 223 35 03			
5	Ул. Якубова, 38, помещение на первом этаже жилого дома, имеется электроснабжение, санузел, холодное водоснабжение, естественное освещение, электроснабжение, отопление. Вход через подъезд совместно с жильцами дома. Под административные цели (офис).	33,3	3 330 000
6	Пр-т Рокоссовского, 5, корп. 1, помещение на первом этаже, имеется естественное освещение, отопление, отсутствует водоснабжение и канализация. Вход через подъезд жилого дома. Под административные цели (офис).	11,4	1 140 000
УП «ЖРЭО Октябрьского района г. Минска», тел. 213 29 60			
7	Ул. Бакинская, 20, четыре помещения и коридор на первом этаже жилого дома, имеется отопление, санузел совместного пользования с другими арендаторами, отсутствует естественное освещение. Требуется ремонт. Под склад	48,6	4 860 000
УП «ЖРЭО Партизанского района г. Минска», тел. 294 01 11			
8	2-ой пер. Багратиона, 20, помещение на 1 этаже, имеется естественное освещение, отопление, общий вход с другими арендаторами, санузел совместного пользования. Под изготовление ключей, ювелирную мастерскую, швейный цех	33,6	3 360 000
УП «ЖРЭО Первомайского района г. Минска», тел. 285 72 92			
9	Пер. Инструментальный, 3, комн. 203 на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, совместно с другими арендаторами водоснабжение и санузел. Под административные цели (офис).	7,8	780 000
10	Пер. Инструментальный, 5, комн. 217 и 218 на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, совместно с другими арендаторами водоснабжение и санузел. Под административные цели (офис).	26,4	2 640 000
УП «ЖРЭО Советского района г. Минска», тел. 292 74 31			
11	Ул. Я. Коласа, 69, помещение на 1 этаже жилого дома, имеется естественное освещение, отопление, водоснабжение, санузел, отдельный вход, требуется ремонт. Под административные цели (офис)	38,6	3 860 000
УП «ЖРЭО № 1 Фрунзенского района г. Минска», тел. 204 30 46			
12	Ул. Бурдейного, 23, помещения банного комплекса с бассейнами на 1 этаже. Имеется естественное освещение, отопление, энергоснабжение, канализация. Под оздоровительные цели (сауну)	77,7	7 770 000
13	Ул. Лобанка, 105, помещение № 1 на 2 этаже, имеется естественное освещение, отопление, электроснабжение. Санузел и вход совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис)	32,9	3 290 000
14	Ул. Лобанка, 105, помещение № 2 на 2 этаже, имеется естественное освещение, отопление, электроснабжение. Санузел и вход совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис)	12,1	1 210 000
15	Ул. Лобанка, 105, помещение № 3 на 2 этаже, имеется естественное освещение, отопление, электроснабжение. Санузел и вход совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис)	12,0	1 200 000
16	Ул. Лобанка, 105, помещение № 4 на 2 этаже, имеется естественное освещение, отопление, электроснабжение. Санузел и вход совместно с другими арендаторами. Под административные цели (офис)	33,6	3 360 000
УП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска», тел. 253 03 26			
17	Ул. Глебки, 2, помещение на 1 этаже, отсутствует естественное освещение, имеется энергоснабжение, другие коммуникации отсутствуют. Под склад	2,7	270 000
18	Ул. Матусевича, 42. Площадь в фойе 1 этажа административного здания УП «ЖРЭО № 2 Фрунзенского района г. Минска». Под вендинговый копировальный аппарат	2,0	200 000
УП «ЖРЭО Центрального района г. Минска», тел.: 203 79 43, 203 34 66			
19	Ул. Л. Украинки, 22, площади первого и второго этажа. Вход через собственника помещений. Производственное использование	198,6	19 860 000
20	Пр. Машерова, 76, подвал, 2 комнаты (39,3 и 19,1 плюс МОП). 39,3 с естественным освещением. Общий вход с другими арендаторами, санузел совместного пользования. Под административные цели (офис)	69,27	6 927 000
21	Пр. Машерова, 76, подвал. 4 комнаты, 3 из них с естественным освещением. Общий вход с другими арендаторами, санузел совместного пользования. Под творческую мастерскую	117,37	11 737 000
22	Ул. Л. Украинки, 22, зал ресторана и раздевалка, вход через собственника помещений.	54,3	5 430 000
23	Ул. Киселева, 20, подвал, отдельный вход, отопление, водоснабжение, канализация. Под торговый объект	76,7	7 670 000
24	Пр. Победителей, 43, корп. 3, помещение на 1 этаже жилого дома. Имеется естественное освещение, отопление, санузел. Вход совместно с жильцами дома. Под административные цели (офис)	10,9	1 090 000
УП «Минская спадчина», тел.: 226 53 04, 226 47 34			
25	Пл. Свободы, 2, помещение на мансардном этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел и вход общий с другими арендаторами. Под административные цели (офис)	24,3	2 430 000
26	Пл. Свободы, 2, помещение на втором этаже, имеется естественное освещение, отопление, санузел и вход общий с другими арендаторами. Под административные цели (офис)	13,1	1 310 000
